Б 05

Дзяржаўны герб Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

ВЫДАННЕ
ЦК КП(б)Б

№ 6
САКАВІК
1937 г.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, родны наш правадыр і настаўнік!

Табе, наш родны, горача любімы таварыш СТАЛІН, у Міжнародны комуністычны жаночы дзень—8 сакавіка шлем палкае прывітанне ад Усебеларускай нарады жанчын нізавога совецкага актыву.

Першыя нашы думкі, першае наша слова аб табе, наш мудры правадыр і настаўнік. У гэтых думках мы выказваем вялікую ўдзячнасць табе, наш родны бацька, за наша шчаслівае і радаснае жыццё, якім жыве зараз свабодная, роўнапраўная жанчына Совецкай Беларусі.

Усім вядома, чым раней была беларуская жанчына, забітая, прыгнечаная, непісьменная; яна цярпела падвойны гнёт—сацыяльны і нацыянальны. Нельга без жудасці ўспомніць аб гэтым кашмарным жыцці сёння, калі нашы сэрцы напоўнены радасцю і шчасцем роўнапраўных совецкіх грамадзян.

Дарагі ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ! Мы добра ведаем, што гэта шчаслівае жыццё завявана пад тваім мудрым кіраўніцтвам, мы асабліва ўдзячны табе за Канстытуцыю соцыялізма, якая належыць твайму генію. У гэтай Канстытуцыі вогненнымі літарамі запісана аб роўнапраўі жанчын ва ўсіх галінах, і гэта з'яўляецца не марамі, а цудоўнай сапраўднасцю. Няма той галіны, дзе-б не прымала ўдзел совецкая жанчына. Гераічныя прыклады паказваюць патрыёткі нашай шчаслівай соцыялістычнай радзімы ва ўсіх галінах нашага жыцця. І на соцыялістычных прадпрыемствах, і на калгасных палях, на абароннай рабоце, на навуковым фронце, у советах—усюды мы бачым, як з беззаветнай адданасцю працуюць нашы жанчыны.

Мы бязмежна ўдзячны табе, дарагі таварыш СТАЛІН, за праяўленыя клопаты аб нас, мацерах, і нашых дзецях. Мы ўдзячны табе за тое; што мацярынства ў нас стала радасцю і шчасцем. Нашы дзеці вучацца ў сталінскіх школах, выхоўваюцца ў палацах піянераў, адпачываюць у санаторыях і лагерах. Мы заўсёды памятаем, што нашы дзеці маюць шчаслівае дзяцінства толькі таму, што яны горача любімы табою; таму імя тваё—найдаражэйшае ў свеце імя як для нас, так і для нашых дзяцей.

Абяцаем табе, наш дарагі, родны бацька, выхаваць у нашых дзецях гарачую любоў да сваёй соцыялістычнай радзімы, мы выхаваем з іх дастойных сыноў сваёй соцыялістычнай бацькаўшчыны.

На нашай нарадзе прысутнічаюць гераіні соцыялістычнай працы—слаўныя ордэнаноскі. Абяцаем табе не шкадаваць сіл, каб да слаўных імён ордэнаносцаў тт. Каўдзеркі, Рыгаровіч, Казарынавай, Канстанцінавай, Вілетнікавай, Башкіравай, Гарэлік, Кісель і раду другіх выхаваць са свайго асяроддзя новых гераінь працы, якімі па праву будзе ганарыцца наша Совецкая Беларусь.

Мы дадзім новыя атрады стаханавак соцыялістычных прадпрыемстваў і калгасных палёў. Мы пакажам прыклад прадукцыйнасці працы, прыклад барацьбы за высокую якасць прадукцыі.

Мы ніколі не забываем, што жывем на рубяжы з капіталістычным светам. Мы памятаем, што фашысты ў шалёнай нянавісці да Совецкага Саюза рыхтуюць напад на нашу радзіму, таму мы ўсе свае сілы аддамо на ўзмацненне абароназдольнасці нашай краіны.

І калі толькі патрэбуецца, па закліку нашай роднай комуністычнай партыі мы станем у рады Чырвонай арміі, каб абараніць наша свабоднае і радаснае жыццё.

Разам з табой, наш друг, таварыш СТАЛІН, мы сумуем па поваду смерці любімага СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ—твайго бліжэйшага саратніка і друга. Мы ведаем, што яго заўчасную смерць паскорылі тройчы праклятыя ворагі народу—трацкісты.

Мы абяцаем табе, наш родны бацька, яшчэ вышэй узняць нашу рэволюцыйную пільнасць і выкарчаваць да канца агідных ворагаў народу—трацкістаў, правых контррэволюцыянераў, нацыяналістаў розных масцей і т. д. Мы яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол комуністычнай партыі і цябе, наш любімы СТАЛІН.

Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі мы ўпэўнена пойдзем наперад да новых перамог.

Доўгія, доўгія годы жыві, наш родны таварыш СТАЛІН, на радасць нам, жанчынам, на радасць усяго працоўнага чалавецтва!

ГІСТАРЫЧНЫЯ РАШЭННІ

ГОСУДАРСТВЕННАЯ Б-КА БССР

Нядаўна адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі большэвікоў. Пленум абмеркаваў пытанні: аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з надыходзячымі выбарамі Вярхоўнага Совета СССР на аснове новай Канстытуцыі, гаспадарчага і партыйнага будаўніцтва, і разглядзеў пытанне аб антыпартыйнай дзейнасці Бухарына і Рыкава і пастанавіў выключыць іх з радоў ВКП(б).

Рашэнні пленума маюць велізарнае гістарычнае значэнне. Ён адбыўся пасля прыняцця Сталінскай Канстытуцыі—гэтага гістарычнага дакумента нашай эпохі. Сталінская Канстытуцыя азначае паварот у палітычным жыцці краіны. Канстытуцыя Саюза ССР уводзіць усеагульныя, роўныя і прамыя выбары пры тайным галасаванні для ўсіх грамадзян Совецкага Саюза. Новыя выбары будуць сапраўды дэмакратычнымі выбарамі.

У выніку новай выбарчай сістэмы яшчэ больш узмацняецца дыктатура пролетарыята і магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы.

«Дыктатура пролетарыята,—гаворыцца ў рэзалюцыі пленума па дакладу тав. Жданава,—становіцца больш гібкай, і, стала быць, больш магутнай сістэмай дзяржаўнага кіраўніцтва рабочага класа грамадствам, база пролетарскай дыктатуры расшыраецца, яе аснова становіцца больш моцнай».

Падрыхтоўка к прадстаячым выбарам Вярхоўнага Совета краіны выклікала вялікі ўздым палітычнай актыўнасці мас. Гэты паварот у палітычным жыцці краіны павінна ўзначаліць наша партыя, якая з'яўляецца перадавым атрадам працоўных.

Велізарным давер'ем карыстаецца наша партыя—партыя Леніна—Сталіна сярод усіх працоўных нашай краіны. І ў гады падполля, і на франтах грамадзянскай вайны, і ў гады будаўніцтва соцыялістычнага грамадства, наша партыя была прызнаным кіраўніком мас і карысталася велізарным аўтарытэтам. Няма сумненняў, што падрыхтоўка да выбараў па-новаму яшчэ на большую вышыню ўзніме кіруючую ролю комуністычнай партыі. Што партыя павінна зрабіць да падрыхтоўкі к новым выбарам,—з выключнай яскравасцю сказана ў рэзалюцыі пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава.

«Для гэтага патрабуецца, каб партыя сама праводзіла паслядоўную дэмакратычную практыку, каб яна праводзіла да канца ва ўнутрыпартыйным жыцці асновы дэмакратычнага цэнтралізма, як гэтага патрабуе статут партыі, каб яна сама мела неабходныя ўмовы, у сілу якіх усе органы партыі з'яўляліся-б выбарнымі, каб крытыка і самакрытыка развівалася ў поўнай меры, каб адказнасць партыйных органаў перад партыйнай масай была поўная і каб сама партыйная маса была поўнасцю актывізавана».

Статут партыі і асновы дэмакратычнага цэнтралізма ў радзе партыйных арганізацый груба парушаліся. Гэта ў першую чаргу выявілася ў сэнсе адыхода ад выбарнасці парторганаў і прымянення практыкі кааптацыі. Гэта нецярпімая практыка была асабліва распаўсюджана ў партыйных арганізацыях нашай рэспублікі. У буйнейшых партарганізацыях Беларусі парушаўся статут партыі і асновы дэмакратычнага цэнтралізма. У Гомелі, Оршы, Магілеве, Віцебску, Барысаве, Лепеле шырока ўжывалася шкодная практыка кааптацыі ў склад гаркомаў, райкомаў і парткомаў. У Гомельскім гаркоме, з 52 членаў гаркома, было кааптавана 40.

Практыка кааптацыі безумоўна была на руку, класавым ворагам. Гэта-ж факт, што ў тых арганізацыях, дзе парушаўся статут партыі, лягчэй было пралезці і весці сваю шкодніцкую работу, лютым ворагам народа—трацкістам і правым адшчапенцам. Гэта-ж факт, што ў тых арганізацыях палітычная пільнасць была больш прытуплена. Нельга ні на мінуту забываць, што мы жывем на граніцы з капіталістычным светам. Нельга ні на мінуту забываць, што капіталісты праз нашу тэрыторыю імкнуцца пераКінуць шпіёнаў, дыверсантаў, трацкістаў. Вось чаму мы заўсёды павінны памятаць словы нашага мудрага правадыра таварыша Сталіна, што рэволюцыйная пільнасць з'яўляецца той якасцю, якая зараз асабліва неабходна большэвікам.

Парушэнне асноў дэмакратычнага цэнтралізма тармазіла рост актыўнасці членаў партыі, перашкаджала разгортванню большэвіцкай самакрытыкі. А вядома, што самакрытыка з'яўляецца неадлучнай пастаянна дзейнічаючай зброяй большэвізма. Самакрытыка—вострая зброя партыі—павінна быць зараз асабліва высока ўзнята.

У хуткім часе адбудуцца выбары ў кіруючыя партыйныя органы. Выбары па рашэнню Пленума ЦК ВКП(б) будуць праходзіць пры тайным галасаванні. Шырокае разгортванне большэвіцкай самакрытыкі, шырокае абгаварэнне кожнай высунутай кандыдатуры, тайнае галасаванне, забяспечаць абранне ў парткомы, райкомы і іншыя кіруючыя парторганы лепшых большэвікоў, праверaных у барацьбе з усімі ворагамі рабочага класа, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна і Цэнтральнаму Камітэту большэвікоў.

Вялікае значэнне зараз набывае пытанне аб большэвіцкім выхаванні кадраў. Наша партыя выхавала дзесяткі тысяч людзей—кіраўнікоў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Але ў многіх партыйных арганізацыях імкнуліся гэтыя кадры у першую чаргу навучыць тэхніцы той галіны работы, якой яны кіруюць. Аб партыйным, палітычным выхаванні кадраў часта забывалі.

«Праблема большэвіцкага выхавання кадраў,—піша «Правда» ў перадавым артыкуле ад 10 сакавіка,—зараз самая важная праблема для ўсіх партыйных арганізацый. Лозунг аб аўладанні тэхнікай партыя дапаўняе зараз лозунгам АЎЛАДАННЯ БОЛЬШЭВІЗМАМ. Падкаваць нашы кадры ідэалагічна, зрабіць іх сапраўднымі марксістамі-ленінцамі, людзьмі шырокага палітычнага гарызонту, здольнымі правільна арыентавацца ва

ўнутранай і міжнароднай палітыцы,—ДАБІЦЦА ГЭТАГА, ЗНАЧЫЦЬ ВЫРАШЫЦЬ ДЗЕВЯЦЬ ДЗЕСЯТЫХ УСІХ ЗАДАЧ ПАРТЫІ».

Магчымасцей для вылучэння і выхавання новых кадраў у нас вельмі многа. Тав. Жданаў у заключным слове сказаў: «Вы паглядзіце, як хутка ў нас растуць партыйныя і беспартыйныя людзі, паглядзіце на рост стаханаўцаў, ды і не толькі стаханаўцаў. А вазьміце рух жонак камандзіраў Чырвонай арміі і работнікаў прамысловасці, успомніце нядаўнія ўсесаюзныя нарады. У сэнсе яркасці, сакавітасці, поўнацэннасці іх выступленняў, у сэнсе выбару новых форм і новых метадаў агітацыі, па багаццю тэм, зместу і формы прамоў, многія з іх, чэснае слова, заткнуць за пояс іншых прысяжных і паліняўшых нашых агітатараў».

Выключнае значэнне ў падрыхтоўцы да новых выбараў набывае агітацыя. Нашай агітацыяй павінны быць ахоплены ўсе слаі насельніцтва. Шырачайшыя масы працоўных жанчын—работніц, служачых, калгасніц, аднаасобніц, хатніх гаспадынь, жонак ІТР павінны быць ахоплены яркай большэвіцкай агітацыяй. Партыйныя арганізацыі Беларусі павінны вылучыць лепшых агітатараў на гэтыя ўчасткі.

Рашэнне пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні з партыі Бухарына і Рыкава сустрэнута большэвікамі і працоўнымі Совецкай Беларусі з велізарным задавальненнем. Подлая і варожая дзейнасць правых адшчапенцаў Бухарына і Рыкава вядома ўсім працоўным нашай краіны. Праклятыя двурушнікі! Яны разам з трацкісцкімі бандытамі хацелі зацягнуць на шыі рабочых і сялян Совецкага Саюза пятлю капіталізма. Рэзалюцыі партыйных сходаў, рэзалюцыі сходаў рабочых поўны гневам і нянавісцю да гэтых чалавечых выродкаў.

— Бухарын і Рыкаў разам з заклятымі ворагамі народу—трацкістамі хацелі вярнуць нам капіталізм. Адабраючы пастанову ЦК ВКП(б), мы просім урад аддаць пад суд гэтых здраднікаў радзімы і судзіць іх па ўсёй суровасці совецкіх законаў,—заявіла ў сваім выступленні, пад усеагульнае адабрэнне прысутных, комсамолка Равіч на сходзе рабочых менскай чырвонасцяжнай фабрыкі «Кастрычнік».

Партыйныя арганізацыі нашай рэспублікі ўзяліся за глыбокае вывучэнне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б). Гэтыя рашэнні неабходна давесці да кожнага члена і кандыдата партыі, да кожнага спачуваючага. Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) з'яўляюцца нашай праграмай дзеяння для далейшай барацьбы за комунізм.

Гурток па вывучэнню гісторыі ВКП(б) жонкамі камандзіра і начальніцкага складу часці, якой камандуе маёр тав. Кузняцоў. У цэнтры кіраўнік гуртка— батальённы камісар тав. Ечыпуеў.

ПА НАКАЗУ выбаршчыкаў

З-за пышна разросшыхся фікусаў у пакоі стаялі зеленаватыя прыцемкі. На кухні шыпеў прымус. Іван Пятровіч паставіў на стол чайнік і прысеў на дыван у чаканні жонкі. Неўзабаве стукнулі дзверы. Марыя Пятроўна скінула галошы і з радаснай усмешкай накіравалася ў пакой.

— Чаму ты не п'еш чаю?—запыталася яна мужа.

Той нічога не адказаў. Бачна было па яго твару, што ён злуе...

— Не справа гэта для цябе лётаць па горсоветах,—нарэшце, прагаварыў ён.

— Не, Іван, ты не праў. Я сёння шмат чаго зрабіла і таму я задаволена сваёй адказнай нагрузкай.

Паправіўшы валасы, яна пачала расказваць пра ўсе здарэнні, якія адбыліся за дзень.

— Вось работніца Пятрусевіч мне часта скардзіцца, што яе кватэра пагражае абвалам. Ты падумай і зразумей, што тут дапамога дэпутацкай групы неабходна...

Муж нешта хацеў сказаць, але Марыя Пятроўна пачала наліваць чай. Злосць мужа хутка знікла пасля пераканання жонкі.

Задоўга да пачатку работы, Марыя Пятроўна з'яўляецца ў цэху. Кожную вольную хвілінку яна скарыстоўвае на грамадскую работу. Яна абыходзіць агрэгаты фабрыкі, распытвае ў работніц пра скаргі і непаладкі.

Вось і сёння так.

— Я да цябе, Марылечка,— усхвалявана прагаварыла ўжо немаладая работніца.

— Калі ласка, слухаю,—адказала таварыш Кабернік.

— Ведаеш,— пачала тая, убачыўшы заўсёды радушны твар старшыні дэпутацкай групы, і падрабязна расказала ёй пра бясконцую хаду ў жакт.

— А ты не хвалюйся, мы гэта ўладзім, — супакойвала Марыя Пятроўна работніцу, а скаргу запісала ў блакнот. Гэта маленькая кніжачка ўся перапоўнена такімі скаргамі і пытаннямі, якія тав. Кабернік старанна высвятляе ў горсавеце.

— Самае галоўнае ў нашай рабоце,—кажа тав. Кабернік,— гэта ведаць кожнага чалавека, умець з ім размаўляць. Адны патрабуюць аднаго, другія—другога. Неабходна справу кожнага адчуваць сваёй, і тады справа забяспечана. Вось аснова працы дэпутацкай групы.

Свой асабісты прыклад адданасці і чуласці да людзей Марыя Пятроўна паказала з першых дзён, як стала дэпутатам горсавета. Спачатку нерашуча ўцягвалася маладая жанчына ў грамадскае жыццё, але совецкая краіна вучыць смеласці сваіх грамадзянак. Яна падымае работніцу, праявіўшую свае здольнасці, усё вышэй і вышэй.

Ад зборшчыка членскіх узносаў у брыгадзе да старшыні дэпутацкай групы,—вось шлях грамадскай работы Марыі Пятроўны.

Асновай яе работы стаў наказ выбаршчыкаў: упарадкаванне ўскраін горада, удзел у пабудове для дзетвары прыгожага палаца піянераў, фабрычныя яслі, ізалятары для дзяцей і т. д.

Але гэта не ўсё. Клопаты аб жывым чалавеку, аб яго патрэбах на вытворчасці і ў быту,— гэта вялікая галіна працы дэпутацкай групы.

І Марыя Пятроўна дабілася ў адпаведных арганізацый грашовай дапамогі. Сорак работніц-адзіночак атрымалі для дзяцей баціначкі, паліто. Некаторыя дзеці бясплатна атрымоўваюць абеды ў фабрычнай сталовай.

Прыкладаў уважлівых, пяшчотных адносін да людзей з боку тав. Кабернік многа. Гэтая чуласць выпрацавалася яшчэ ў дзіцячыя гады. Яна добра памятае сваё бязрадаснае дзяцінства, калі зусім маленькай засталася без мацеры.

Гэта мінулае і наша совецкая сапраўднасць выкавалі з Марыі Пятроўны дастойнага грамадзяніна нашай эпохі.

Члены дэпутацкай групы не адстаюць ад свайго старшыні. Стаханаўка Вашкевіч, актывістка горсовета, працуе на ўцюжцы. План яна заўсёды выконвае на 112—118 проц. Члены горсовета—Люба Абмётка і Якавенка таксама стаханаўкі па строчцы каўнераў, адставаць ім нельга, таму што тав. Кабернік з сваёй брыгадай выконвае план новых норм на 120—130 проц.

Такія людзі, як Кабернік, Вашкевіч, Якавенка і шмат другіх лепшых стаханавак, якімі багата фабрыка, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, забяспечылі выкананне вытворчай праграмы на 100,5 проц., звыш плана далі прадукцыі на 350 тысяч рублёў. Для гэтых поспехаў фабрыкі імя 8 сакавіка не мала папрацавала дэпутацкая група горсовета і яе старшыня.

Вось чаму Марыя Пятроўна за кароткі тэрмін работы старшынёй дэпутацкай групы заваявала вялікі аўтарытэт сярод усяго рабочага калектыва фабрыкі.

Надзеждзіна

Менск

Тав. Павлюченко—старшыня Рыжкаўскага сельсовета Шклоўскага Раёна.

У Міжнародны комуністычны жаночы дзень 8 сакавіка 6 тыс. жанчын Варашылаўскага раёна гор. Менска арганізавалі 5-кілометровы пераход у процігазах. На здымку: група ўдзельніцаў пераходу ў часе руху па Совецкай вуліцы.

Фото Я. Салавейчыка.

РЫХТУЕМСЯ ДА ВЫБАРАЎ ПА-НОВАМУ

З усіх канцоў Совецкай Беларусі з'ехаліся жанчыны-актывісткі советаў, каб падзяліцца вопытам работы.

Я ніколі не падумала-б, што мне—дачцы батрака, жонцы радавога рабочага-чыгуначніка выпадзе такое шчасце быць удзельніцай усебеларускай нарады.

Якая прыгожая зала з'езда Советаў. Няма такіх слоў, каб выказаць маё захапленне ў гэтыя незабыўныя дні.

Адчыненне нарады дэлегаткі сустрэлі громам апладысментаў і прывітальнымі воклічамі ў гонар вялікага і роднага Сталіна, у гонар таго, хто даў жанчынам правы на жыццё.

Я не зводзіла сваіх вачэй з радасных твараў маладых дзяўчат—удзельніц нарады. Ва ўспамінах усплылі малюнкі сваёй бязрадаснай маладосці.

З 10-гадовага ўзроста пайшла я працаваць па найму за 15—20 капеек у дзень. Доўга служыла хатняй работніцай, дзе адчула ўсе цяжкасці эксплаатацыі. Аб вучобе і марыць не прыходзілася.

Толькі пры совецкай уладзе я ліквідавала сваю непісьменнасць. Стала актыўным будаўніком сацыялізма.

Вось з 1927 года з'яўляюся членам гарадскога совета. Спачатку была старшынёй бытавой секцыі, а зараз старшынёй секцыі аховы здароўя.

У гэтай галіне, разам з актывам мною праведзена многа мерапрыемстваў. З ранняй вясны штогод пачынаем санітарнае абследванне жылых дамоў і двароў. Арганізавалі дзіцячую пляцоўку на 25 дзяцей. Два разы ў месяц выпускаем насценгазету, дзе змагаемся за палепшанне санітарнага становішча вуліц і дамоў.

За апошні час у нас значна ўзрасла актыўнасць хатніх гаспадынь у абароннай рабоце. Маецца 30 чалавек значкістаў, здаўшых нормы на ГСА і СПХА. За мопраўскую работу наш участак атрымаў прэмію—ганаровую грамату.

Тав. Чарвякоў у сваім простым і зразумелым дакладзе адзначыў, што асноўнае звяно работы Советаў,—гэта секцыі і дэпутацкія групы. Гэта, патрабуе ад нас, кіраўнікоў секцый, яшчэ большай актыўнасці ў падрыхтоўцы да выбараў па новай Канстытуцыі.

І мы — жанчыны — шчаслівыя грамадзянкі Совецкага Саюза, натхнёныя Сталінскай Канстытуцыяй, прыкладзем усе сілы, усе свае здольнасці, каб забяспечыць вялікую актыўнасць жанчын пры новых выбарах.

Камякова

Жлобін

Улічыць урокі мінулага

Крычаўскі цэментны завод з года ў год не выконвае плана.

За студзень - люты месяцы 1937 г. па памолу план выканан толькі на 47,5 проц. а па абжыгу—53,2 проц.

Гэта зусім не выпадкова. На заводзе доўгі час арудвалі трацкісты Іваноў, Каўрыга, Гурэвіч Л., Міронаў. Усёй сваёй шкодніцкай работай яны імкнуліся падарваць магутнасць завода.

Але цяжкі ўрок шкодніцкай работы трацкістаў не ўлічан. Кіраўніцтва завода не перабудавала сваёй работы. Не мабілізавала рабочыя масы на хутчэйшую ліквідацыю ганебнага прарыва на заводзе.

Прапанова перадавікоў Данбаса аб арганізацыі Орджанікідзенскага закліку стаханаўцаў і ўдарнікаў сустрэла гарачы водгук сярод рабочых ва ўсіх канцах Совецкага Саюза.

Рабочыя і работніцы імкнуцца ўвекавечыць памяць любімага камандарма цяжкай індустрыі новым, найвялікшым уздымам стаханаўскага руху, развіццю якога незабыўны тав. Серго аддаў столькі сіл і энергіі.

Большасць прадпрыемстваў Беларусі адгукнуліся на арганізацыю гэтага выдатнага руху. Нічога не зроблена па гэтай важнай справе на цэментным заводзе. Пакуль завадскі камітэт абмяжоўваецца размовамі і яшчэ не падышоў ушчыльную да арганізацыі Оржанікідзенскага закліка.

Не арганізован кантроль за становішчам рабочых месц. Адсутнічае шэфства стаханаўцаў над адстаючымі рабочымі, а галоўнае, адсутнічае кіраўніцтва соцыялістычным спаборніцтвам. Ні ў адным цэху не бачна дошак і дагавораў па соцспаборніцтву. Вытворчыя нарады ў брыгадах не практыкуюцца. Гэтыя відавочныя факты характэрызуюць бяздзейнасць заводскага камітэта ў кіраўніцтве соцспаборніцтвам. І не выпадкова, што большасць рабочых і работніц да гэтага часу не знаёмы з зваротам донбасаўцаў.

Заўком нават не ведае, колькі ў цэху маецца стаханаўцаў і стаханавак. Па спісу лічыцца 350 стаханаўцаў, а фактычна рабочых, выконваючых нормы больш чым на 100 проц., ёсць каля 175 чалавек.

Вылучэннем работніц на больш кваліфікаваныя работы на заводзе не займаюцца. Работніц - стаханавак і ўдарніц вельмі мала. Аднак ёсць такія, якія працуюць узорна. Брыгадзір торфападачы—Дуся Марозава, члены яе брыгады—Марыя Філатава, Елена Скрыпалёва і другія выконваюць план падачы торфа на 120—125 проц. Не дрэнна працуе пры насосных маторах на электрастанцыі комсамолка Жэня Гнядко. Норма падачы вады пры нармальнай працы завода — 13200 кіловат-гадзін, а яна падае 17—18 тысяч кіловат-гадзін.

Гэтыя работніцы імкнуцца забяспечыць бесперабойную работу ўсяго завода, паказваючы добрыя прыклады работы. Але іх на заводзе мала хто ведае. Абмена вопытам стаханаўскай работы завадскі камітэт не арганізаваў.

Завадская шматтыражка не назвала ні аднаго прозвішча стаханаўкі-жанчыны. Побач з стаханаўцамі-мужчынамі ў вітрыне стаханаўцаў, якая вісіць у клубе, таксама не паказана ні адной работніцы. Такое становішча даказвае дрэнную пастаноўку масавай работы сярод работніц.

Кіраўніцтву цэментнага завода неабходна ўлічыць урокі мінулага і пачаць працаваць па-наваму.

Неабходна надаць стаханаўскаму руху дастойны размах. Гэта магчыма будзе зрабіць толькі тады, калі масава-палітычная работа заб'е на заводзе поўным ключом.

Лагунова

Крычаў

Лабаранткі Балотнага Інстытута. тт. Л. Гаўрылава і Г. Варабей даследуюць батанічную глебу калгаса імя Сталіна Менскага раёну.

Фота С. Грына і В. Лейна (Белсаюзфота)

Радасць жыцця

—Ніколі раней я і не марыла, што паеду адпачываць у Крым. Я ведала, што ёсць такія месцы, дзе заўсёды цёпла, дзе ёсць мора. Ведала таксама, што ў такія прыгожыя месцы ездзілі багацеі праводзіць свой час. А цяпер асноўная маса адпачываючых на нашых курортах—гэта стаханаўцы, лепшыя людзі нашай краіны, аб якіх так клапоцяцца партыя і ўлада.

Многа для мяне тут было цудоўным. Асабліва здзівіла мяне мора. Ніколі ў сваім жыцці я яго не бачыла. Уважліва і падоўгу глядзела я на яго. Якое яно вялікае і прыгожае! Берагоў не убачыш. Рознымі колерамі пераліваецца.

А парк які, а санаторы! Колькі прыгожасці! І ўсімі гэтымі прыгажосцямі калісьці карысталася толькі маленькая кучка багацеяў.

Адпачывала я вельмі добра. Паправілася на 8 кілограм. Загарэла на сонцы, прымала рознае лячэнне. Шкадавала толькі, што не магла купацца ў моры: забаранілі мне ўрачы.

Уважлівыя і чулыя адносіны былі да ўсіх нас. Калі я ад'язджала, мяне праводзілі на станцыю. Далі тэлеграму дзяжурнаму па станцыі Харкаў, каб мне дапамаглі пры перасадцы з поезда на поезд. Як толькі поезд падышоў да станцыі, мяне ветліва сустрэлі і прапанавалі адпачыць, а потым дапамаглі сесці ў вагон, які ішоў на Менск.

Такая-ж сустрэча была і ў Асіпавічах, дзе таксама была перасадка з поезда на поезд. Гэта хвалявала мяне да слёз. Я не ведала, як дзякаваць.

Раней я і думаць не магла аб такіх сустрэчах, аб такім адпачынку. Гэта магчыма толькі ў нас—у краіне соцыялізма, дзе

Соф'я Антонаўна Рыгаровіч.

кожны чалавек мае права на працу, на адпачынак, на асвету.

Мне 53 гады, але працаваць я імкнуся, як мага лепей, з усёй сваёй адданасцю. Партыя і ўрад вельмі высока ацанілі маю працу: у пачатку 1936 года я атрымала вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна. Як-жа мне не радавацца такому шчасліваму, светламу жыццю? Балюча толькі робіцца, што маладыя гады ўжо прайшлі.

Сэрца замірае, калі ўспомніш як жылі мы раней. Усё змянялася на белым свеце, толькі суровая доля сялянская не мянялася. Тады спрадвечна цярпеў гора селянін. Зямлі было мала. Дзеды бацькам, бацькі дзецям казалі: „не чутна шчаслівай мужыцкай долі"...

Работа агнём гарэла ў маіх руках, а шчасця не было ў жыцці. Замуж вышла рана, за немца, ды пры тым, нявенчаная жыла. А ў той час гэта была самая вялікая ганьба. Цяжка было жыць, нічога не мелі свайго. Цэлы дзень гнула спіну на чужых палях.

Рэволюцыя аслабаніла нас ад гнёту. Па другому жыццё пайшло. Пасля калектывізацыі па другому зажыла і я. Выпрамілася сагнутая спіна. Чэсна і аддана стала я працаваць у калгасе, а потым у соўгасе. Заможна стала жыць.

Жыццёвы шлях пройдзен не малы, але зараз гады плеч не цягнуць. Па гадах мне на печы сядзець, а па прагнасці да работы ды спрытнасці я маладзейшым не ўступаю. Маладыя прыходзяць да мяне за парадай. Я ім свой вопыт перадаю, і адчуваю вялікую радасць ад жыцця і працы.

Зараз, адпачыўшы, я з яшчэ большай энергіяй узялася за работу. У маёй групе кароў ёсць ужо 6 рэкардыстак, якія даюць найвышэйшыя па ферме ўдоі малака—8.000 літраў. Пяць маіх рэкардыстак пасылаюцца ў Маскву на ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Я шчаслива, што абяцанне, данае вялікаму Сталіну, я з гонарам выканала.

Соф'я Антонаўна Рыгаровіч

Соўгас „Рачкавічы",
Чырвонаслабодскага раёна

СУСВЕТНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАМОГІ СОЦЫЯЛІЗМА НАТХНЯЮЦЬ І МАБІЛІЗУЮЦЬ ЖАНЧЫН НАШАЙ СОВЕЦКАЙ КРАІНЫ НА ДАЛЕЙШАЕ АВАЛОДВАННЕ КУЛЬТУРАЙ, ТЭХНІКАЙ, НАВУКАЙ, НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫСОКУЮ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ.

(З пастановы ЦК ВКП(б) аб Міжнародным комуністычным жаночым дні 8 сакавіка).

ПЯЦЬ ДЗЁН У МАСКВЕ

За выдатную стаханаўскую работу мы былі прэміраваны пуцёўкамі на экскурсію ў сталіцу працоўных ўсяго свету—у Маскву. Мы, 10 чалавек экскурсантаў—работнікаў малакасоўгасаў, сабраліся ў ЦП саюза амаль з усіх канцоў нашай ордэнаноснай БССР. Жанчын было трое—дзве даяркі і загадчыца дзіцячымі яслямі.

Выехалі мы 2 лютага ўвечары скорым поездам з Менска, а раніцой прачнуліся ў Маскве. У 10 гадзін раніцы мы ўжо былі ў цудоўным доме турыста, на Арбаце. Уперадзе ў нас было 5 незабыўных дзён знаёмства з Масквой, з яе прыгожасцямі.

У гадзіну дня наша экскурсія наведала самае лепшае ў свеце метро. Быццам у казцы мы апускаліся па лесніцы на глыбіню больш трох дзесяткаў метраў. Мы стаялі на сходах і плаўна спускаліся ў бясконцы танель, а насустрач нам глядзелі палацы. Лесніца выносіла нерухома стоячы натоўп людзей на вышыню некалькі паверхаў.

Мы імчаліся ў раскошных паяздах электрычнай падземнай чыгункі. Ні на адзін момант не адчувалі мы сябе пад зямлёй: усюды так многа святла і паветра.

Вось мы ў музеі Рэволюцыі. Дзесяткі зал велізарнейшага палаца—у дакументах і мастацкіх карцінах расказалі нам аб трох рэволюцыях—1905 года, лютаўскай і вялікай Кастрычніцкай.

Тут так ярка паказана, як вялікая комуністычная партыя большэвікоў, пад кіраўніцтвам геніяльнейшых правадыроў—Леніна і Сталіна, арганізоўвалі рабочы клас і бядняцка-серадняцкае сялянства на пабудову соцыялізма ў нашай краіне.

На другі дзень мы наведалі скарбніцу сусветнага мастацтва—Трэцьякоўскую галерэю. Асаблівае ўражанне на нас зрабіла выдатная карціна нашага мастака—ордэнаносца Герасімава „Паседжанне Рэўваенсовета РСЧА". Каштоўным упрыгожаннем Трэцьякоўскай галярэі з'явілася выстаўка карцін геніяльнага мастака Сурыкава: „Ссылка баярыні Марозавай", „Пакарэнне Сібіры Ермаком", „Сцяпан Разін" і іншыя.

Пасля абеда мы былі ў музеі Леніна. Мы ўсё бачылі: урачысты траурны зал з чырвонымі сцягамі, вянкамі і пасмяротнай маскай Ільіча пад шклом, паліто Ільіча, прастрэленае ізуверкай Каплан, рабочы габінет вялікага генія чалавецтва.

У шматлікіх залах музея перад намі прайшло ўсё жыццё Владзіміра Ільіча, пачынаючы з ранняга дзяцінства, уся гісторыя нашай гераічнай партыі, самыя выдатныя старонкі з жыцця нашага вялікага СССР.

Удзень была цікавая экскурсія „ад Масквы феадальнай і капіталістычнай да Масквы соцыялістычнай".

З Маскварэцкага маста мы аглядзелі Крэмль, потым пайшлі ў Кітай-горад. Якая выключная розніца—сярэдневякоўе, вузкія і крывыя завулкі Кітай-горада і велічэзныя праспекты сучаснай Масквы з такімі гігантамі палацамі, як дом Соўнаркома СССР і гасцініца „Масква".

Вечарэла.. Мы вышлі на Чырвоную плошчу. Злева быццам ядавіты мухамор—цэркаў Васілія Блажэннага (цяпер музей). Вось цёмнае месца, дзе трыста год таму назад рубілі галовы і чэцвертавалі...

А каля крэмлёўскіх сцен стаіць вялікі маўзалей. З трэпетным пачуццём, з поўнымі слязьмі вачыма мы прайшлі каля шклянай труны вялікага кормчага рэволюцыі—Владзіміра Ільіча Леніна.

А на другі дзень мы пайшлі на стаханаўскую выстаўку. Гэта выдатны паказ таго, як людзі, аўладаўшыя тэхнікай, робяць цуды.

Тут мы ўбачылі і зразумелі, як дабіліся бліскучых перамог Стаханавы, Бусыгіны, Вінаградавы, Крываносы.

Увечары—філіял Вялікага тэатра, дзе ішла раскошная пастаноўка оперы „Царская невеста". У тэатры мы бачылі выдатную ігру народных артыстаў рэспублікі.

У дзень ад'езду мы былі ў планетарыі. Казачная змена дня і ночы, рух зорак, луны і сонца. Але вось і вечар, і мы ў поездзе... Масква засталася далёка, як казка.

Як мы ўдзячны нашай партыі і ўраду, нашаму мудраму, любімаму і вялікаму правадыру Сталіну, які даў нам шчаслівае жыццё, даў нам магчымасць пабываць у Маскве і ўбачыць усе яе багацці.

Мы даём абяцанне працаваць яшчэ лепш, каб мець шчасце пабываць яшчэ раз у Маскве і паглядзець на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы дасягненні нашай вялікай краіны за 20 год соцыялізма.

Эміля Янкоўская—стаханаўка—даярка соўгаса імя Ланге (Гомель).

Марыя Сушкевіч—стаханаўка—даярка соўгаса „Вялікія Новасёлкі" (Дзяржынскі раён).

Марыя Лебедзевіч—загадчыца дзіцячымі яслямі соўгаса „Вязем-Фаніпаль").



Дзеці камандзіраў N-скай часці—выдатнікі вучобы. Злева—направа: Бора Мызнікаў, Саша Аладзінскі, Лія Перабаскіна, Галя Сянінеевіч, Толя Охламенка, Юра Ісекаў, Тома Цімафеева, Жорж Гушча і Віця Мешчаракоў.
Фота Кісялёва.

На нарадзе вылучэнак

Гэта было напярэдадні 8 сакавіка—Міжнароднага комуністычнага жаночага дня. Калгасніцы-вылучэнкі Заслаўшчыны сабраліся на сваю першую раённую нараду, скліканую па ініцыятыве журнала „Работніца і калгасніца Беларусі".

Іх было 81—бадзёрых, жыццерадасных, па-святочнаму апранутых. Яны сабраліся, каб к дню Міжнароднага свята жанчын падвесці вынікі сваёй работы, падзяліцца вопытам па падрыхтоўцы да другой стаханаўскай вясны і расказаць аб тым, як ім дапамагаюць кіруючыя раённыя арганізацыі.

Смела і ўпэўнена адна за другой падыходзілі яны да стала прэзідыума і расказвалі сабраўшымся жанчынам аб тым, як яны, у мінулым цёмныя, забітыя сялянкі, якія ведалі толькі гора, нужду і здзекі, зараз у калгасах сталі роўнапраўнымі ўдзельніцамі соцыялістычнага будаўніцтва. Як яны пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і мудрага правадыра працоўных вялікага Сталіна будуюць шчаслівае, заможнае жыццё.

У большасці пажылыя жанчыны, яны добра памятаюць лёс жанчыны пры царызме, калі жанчыну нават за чалавека не лічылі. Над ёй здзекваліся не толькі паны і папы, а нават свой бацька, свёкар і муж. І таму так радасна сёння адчувае сябе жанчына - калгасніца - роўнапраўны грамадзянін вялікага Совецкага Саюза, аб якой клапоціцца партыя і ўрад, якой Сталінская Канстытуцыя забяспечыла ўсе правы нароўні з мужчынамі.

Як горача гучэлі словы тав. Зубкоўскай — брыгадзіра агародняй брыгады з калгаса імя Дзержынскага:

— Хто маю маці калі склікаў на нараду? Хто з ёй лічыўся? А мяне вось выклікаюць на нараду, мяне паважаюць, са мною лічацца. Бацькі нашы век гаравалі без зямлі, за розныя нядоімкі іх секлі бізунамі, а мы атрымалі зямлю на вечнае і бясплатнае карыстанне. Я хоць і старая, а сапраўдным жыццём ж ву толькі 19 год. Я зараз працу і песні спяваю, бо праца ў н стала радаснай, жыццё стала шча лівым. У мінулым годзе мая бр гада са сваіх 19 га гародаў атр мала па 400 цэнтнераў бурако 500 цэнтнераў бручкі. А зараз бяром абавязак атрымаць не мен 900 цэнтнераў буракоў і бручкі кожнага гектара.

— У мінулым мы ведалі толь прасніцу,—пачала сваё выступле не тав. Харук з калгаса „13 га віна".—Мы паілі сваіх дзяцей м кам, адурманьвалі іх, каб я больш спалі і далі нам магчымас працаваць. А зараз мы спакой працуем на полі, бо ў дзіцяч яслях нашы дзеці дагледжаны накормлены. Яны растуць вясёл мі, здаровымі і разумнымі.

Пра падрыхтоўку да другой с ханаўскай вясны і выхаванне ж ночага актыва ў сваіх выступле нях гаварылі старшыня Сёмкав Гарадзецкага сельсовета Ры Якубовіч і брыгадзір паляводч брыгады калгаса „Чырвоны буда нік" Зося Куракевіч.

Аб сваім шчаслівым жыцці стаханаўскай рабоце гаварылі ама усе 23 выступаўшыя жанчын Адказныя за лён расказвалі, яны рыхтуюцца да таго, каб атр маць не менш 8—9 цэнтнер ільновалакна з гектара. Яны бралі попел і птушыны памёт, в везлі на свае ўчасткі гной і тор нарыхтавалі мінеральнае ўгнаен праверылі насенне на ўсхожасц падабралі звенні, і хоць заўтра г товы выйсці ў поле і пачаць б рацьбу за стаханаўскі ўраджай.

Ордэнаноска Антаніна Кірмаш адказная па ільну калгаса „Звязда ва ўсіх 6 брыгадах арганізавала 4 ільнаводчых звяна, у якія ўва шлі лепшыя калгасніцы. Яны бралі 180 цэнтнераў попелу і цэнтнераў птушынага памёту. У насенне адсартавана, ачышчана палатне і праверана на ўсхожасц Кожнае звяно ведае свой участа

Жанчыны Заслаўшчыны жыву на рубяжы з капіталістычным Зах дам. Ім бачна, у якіх жудасн умовах жывуць сялянкі за мяжо Там, знясіленыя цяжкай прац яны гнуць спіны на сваіх вузень палосках або пакутуюць на панск абшарах. Калгасніцы ведаюць, ш фашысты імкнуцца перакінуць наш бок шпіёнаў і дыверсанта каб пашкодзіць нашаму шчасліву

Клубны работнік горада Калібадам (Таджыкская ССР) Латофітхон Махкамава выконвае таджыкскі народны танец на першым усесаюзным фестывалі народнага танца ў Маскве.

(Саюзфото)

ЭНІК

ыццю. І таму жанчыны-калгасніцы
дана дапамагаюць пагранічнікам
льна ахоўваць нашы совецкія
ежы.

Аб тым, як яна затрымала дыверінта—парушальніка граніцы, расізала на нарадзе Анета Бабовіч з лгаса „Пяцігодка".

— Радасна ахоўваць нашы совецкія межы,—закончыла Анета.—Не апусцім фашысцкіх гадаў ступіць рыднай нагой на нашу чыстую ямлю. Не дапусцім пашкодзіць ашаму соцыялістычнаму будаўніцтву. Мы будуем шчаслівае, заожнае жыццё, і гора таму, хто смеліцца нам перашкодзіць. Мы вядома, разам з чырвонымі пагранічнікамі ахоўваем нашу свяшчэнную зямлю, нашу мірную працу.

Брыгадзір жаночай трактарнай рыгады, Алеся Барташэвіч, у ваім выступленні расказала сараўшымся жанчынам, як дзяўчаты-рактарысткі атрымалі пяршынства спаборніцтве трактарных брыгад ваёй МТС, за што на ўсебеларусай нарадзе трактарыстак Наркамем прэміраваў дзяўчат грашыма, ўсю брыгаду патэфонам.

— І ў гэтым годзе пяршынства е здадзім, — упэўнена заяўляе леся.—Мы добра адрамантавалі вае трактары і гатовы да веснаой сяўбы. Мы будзем змагацца а высокі ўраджай калгасных палёў.

Кожная з выступаўшых жанчын орача дзякавала комуністычную партыю, совецкі ўрад і асабіста ялікага Сталіна за клопаты аб канчынах і дзецях.

Але ёсць у жанчын і перашкоды ў працы. Галоўная з іх—гэта недастатковая граматнасць. Недастаткова арганізавана ў калгасах і гратэхвучоба. Аб гэтым сведчыць шмат пытанняў, якія задавалі выступіўшаму на нарадзе аграному. У большасці жанчыны цікавяцца як правільна скарыстоўваць пад лён розныя мінеральныя ўгнаенні, як весці барацьбу з ільняной блошкай. Раённым кіруючым арганізацыям патрэбна гэта ўлічыць і часцей пасылаць аграномаў у калгасы для правядзення гутарак з калгасніцамі.

Аб недастатковай дапамозе ёй, як вылучэнцы, гаварыла Надзя Сачок—намеснік старшыні Шаршунскага сельсовета. Трэба больш дапамагаць жанчынам-вылучэнкам, трэба больш вучыць іх у штодзённай практычнай рабоце.

ВЫХОЎВАЕМ АКТЫЎ

Старшынёю сельскага совета мяне абралі нядаўна. У маім сельсовеце тры калгасы. Усе яны рыхтуюцца добра сустрэць другую стаханаўскую вясну. Рамонт інвентара поўнасцю закончан, насенне ачышчана. Праверка на ўсхожасць паказала 98—99 проц. Вывезен гной і торф, сабралі попел і курыны памёт. Рыхтуюць мінеральнае ўгнаенне.

Ва ўсіх калгасах выхоўваецца моцны, здаровы жаночы актыў, які мне дапамагае ў правядзенні грамадскай работы. Дапамагаю ім і я. Часта склікаю іх на нарады ў сельсовеце, раімся з імі, як лепш працаваць, каб атрымаць большы ўраджай.

У калгасе імя Молатава звеняявыя Зіна Абрамчык і Маня Сцепанчук у мінулым годзе здалі лён 26 нумарам. Няма такой грамадскай работы ў калгасе, у якой-бы яны актыўна не ўдзельнічалі.

У калгасе імя Дзержынскага звеннявая Маня Жукоўская больш за ўсіх сабрала попелу і птушынага памёту. Яна падабрала калгасніц у сваё звяно і ўзяла абавязак атрымаць не менш 8 цэнтнераў ільнавалакна з гектара.

Брыгадзір агароднай брыгады Мар'я Зубкоўская ў гэтым годзе абяцае атрымаць не менш 900 цэнтнераў з гектара бручкі і буракоў.

Звеннявая Праскоўя Чартовіч узяла абавязак атрымаць не менш 8 цэнтнераў ільнавалакна з гектара. Каб забяспечыць гэта, яна старанна збірае попел і птушыны памёт.

У калгасе „13 гадавіна" Агата Харук, Пелагея Дзятка, Зося Каўрыга і Кацярына Кашпар працуюць па-стаханаўску і з'яўляюцца лепшымі актывісткамі калгаса.

8 сакавіка ў Міжнародны комуністычны жаночы дзень мы ўрачыста адчынілі новы клуб, у якім ужо працуюць розныя гурткі: драматычны, струнны, харавы. У кожным з іх актыўны ўдзел прымаюць калгасніцы.

Ва ўсіх калгасах у нас працуюць ячэйкі Асоавіяхіма. Арганізаваны чатыры групы самаабароны. Працуе гурток Чырвонага Крыжа, які складаецца выключна з жанчын-калгасніц.

Ёсць у нас і гурток Варашылаўскіх кавалерыстаў з 15 чалавек, але пакуль яшчэ жанчын там няма. Зараз стаўлю сабе мэтай абавязкова ўцягнуць і ў гэты гурток жанчын.

Усё-ж трэба прызнацца, што мы мала працуем з жанчынамі. Трэба больш уцягваць іх у актыўнае і грамадскае жыццё, больш дапамагаць ім у штодзённай рабоце, больш вучыць іх. Прызнацца, мне і самой не хапае агратэхнічных ведаў, бо я не заўсёды магу адказаць на ўсе запытанні калгасніц.

Бяру на сябе абавязак працаваць так, каб разам з стаханаўкамі-калгасніцамі вывесці свой Сёмкава-Гарадзецкі сельсовет на першае месца ў раёне.

Рыва Якубовіч

Заслаўскі раён.

Шасцідзесяцігадовая калгасніца калгаса „Ленінская свабода" Пухавіцкага раёна т. Івашка Елізавета Макараўна, лепшая рукадзельніца ў раёне па вышыўцы ўзораў. НА ЗДЫМКУ: т. Івашка з узорамі сваіх вырабаў. Фото Гиядзько (БСФ).

КАЛГАСНЫ КОНЮХ

На ўзгорку дзве калгасныя канюшні. Калі не заглянеш на канюшню, заўсёды там убачыш рухлявую постаць маладой жанчыны—конюха. Вясёлая ўсмешка грае на вуснах Каці, калі яна абыходзіць коней. Кожнага яна назаве па імені, пагладзіць па грыве, праверыць ці ўсе кармы ён з'еў.

Свой працоўны дзень Каця строга плаціруе. Ды інакш і нельга. Трэба ўправіцца. Упару накарміць коней, напаіць, бульбы наварыць для пойла, пачысціць іх і яшчэ трэба не запамятаць пагутарыць з кожным калгаснікам, які працуе на конях, каб яны гаспадарскім вокам сачылі за коньмі.

— Глядзіце-ж, дзядзечкі, каб не пасціралі коням плячэй,— раіць Каця калгаснікам.

Яшчэ больш уважліва Каця даглядае за жарэбнымі кабыліцамі. Трэці год, як яна працуе на канюшні, але не было ні аднаго выпадку абартавання кабыліц, ні аднаго выпадку падзяжу коней і жарабят. У мінулым годзе нарадзілася дзесяць маленькіх жарабят, і ўсе яны, як адзін, добра растуць і ўкормленыя.

Роўныя кармы для ўсіх коней на канюшні. Але Каціны коні лепш укормлены. І не дзіўна чаму гэта так. На працу Каця заўсёды прыходзіць своечасова, не бывае выпадкаў спазненняў. Своечасова корміць, поіць, чысціць сваіх коней.

Свабодная калгасная праца парадзіла такіх свядомых жанчын, як Каця. Яна стала адной з лепшых людзей калгаснай працы. Інтарэсы калгасных жанчын аднолькавыя з інтарэсамі ўсіх працоўных нашай краіны—будаваць заможнае жыццё, мацаваць абароназдольнасць нашай краіны.

Цвёрда памятае Каця, што конь патрэбен і ў мірнай і ў ваеннай абстаноўцы. Яна даглядае коней, не шкадуючы сіл і часу.

Набліжаецца другая стаханаўская вясна. Калгаснікі калгаса імя ЦК КП(б)Б рашылі дабіцца лепшага ўраджаю, чым у мінулым годзе. Парашылі і дружна ўзяліся за працу. Больш чым на 40 проц. у параўнанні з мінулым годам вывезлі гною і торфу на поле. Адрамантавалі інвентар, ачысцілі насенне. Падрыхтаваліся да сяўбы 1937 года, чакаюць вясны, багатых ураджаяў, важкага працадня. Добры ўраджай дасць магчымасць яшчэ больш пашырыць калгасную гаспадарку і павялічыць прыбытак калгаснікаў.



Тав. Зайцава А. В.—знатны конюх—выдатніца конезавода № 59, са сваім выхаванцам — двухгадовым „Дэсантам". (Белсаюзфота)

Конюх—Каця Гладкая старанна рыхтуе да веснавой сяўбы сваіх коней. Зараз у калгасе налічваецца 120 галоў рагатай жывёлы, 76 коней, 260 птушак, ёсць аўцаферма і свінаферма. У кожнага калгасніка ёсць свая ўласная гаспадарка. Працадзень у мінулым годзе важыў 1 700 грам зернавых і 9 кілаграмаў бульбы. Каця атрымала 55 пудоў зернавых і 290 пудоў бульбы.

—Жывем заможна і радасна. Усяго хапае. Не тое, што раней, калі жыла аднаасобніцай—многа дзён было бясхлебных,—расказвае Каця.—У мяне, у асабістым карыстанні, ёсць карова, свінні, авечкі. Але мая 70-гадовая старэнькая маці не ўседзіць дома і ідзе на працу.

— Кожнаму знойдзецца праца ў калгасе,—гаворыць старая.— Калі ўсе будзем працаваць, то не сорамна будзе за нашу калгасную гаспадарку.

У канцы года падлічылі працадні: у старэнькай маці 177, а ў Каці—515.

Многа занята Каця на канюшні, але гэта ёй не перашкаджае ўдзяляць увагу і выхаванню свайго сына. Смелы, развіты хлапчук ганарыцца сваёй мамай, што яна працуе конюхам. Сяроўжа радасна сустракае маці з работы. Ён ніколі не запамятае спытацца пра коней.

—Мамачка! мамачка! раскажы аб „Галцы" і „Ветцы".

— Радуецца маё сэрца,—гаворыць тав. Гладкая,—што я навучылася чытаць. Да калгаса я была непісьменнай. Пры ўступленні ў калгас не магла нават сама напісаць заяву. Крыўдна было на сябе. Папрасіла напісаць заяву, каб прынялі ў калгас, а свае думкі аб калгасе вусна сказала на сходзе.

У калгасе Каця навучылася чытаць і пісаць. Значна пашырыўся яе светапогляд. Яна скардзіцца на тое, што ў калгасе няма хаты-чытальні, цікавай мастацкай літаратуры. Упарта яна цяпер вывучае Сталінскую Канстытуцыю.

— Прыемна, калі сама чытаеш,—расказвае Каця.—Сваімі вачыма бачыш словы, якія сказаў вялікі наш бацька Сталін, які даў нам шчаслівае і радаснае жыццё.

Жыццё Каці Гладкай сапраўды шчаслівае, радаснае, як і ўсіх совецкіх жанчын. Любяць і паважаюць калгаснікі Кацю за яе добрасумленную працу.

Менскі раён **Александра Ус.**

ГОРДАСЦЬ

На Менск наступалі белапалякі. Як шалёныя зверы рвалі яны знарадамі горад. Сярод разбуральных узрываў чуліся пакутныя стогны параненых, паміраючых...

Соня Ісакаўна правяла ўвесь дзень у суседзяў. Позна ўначы, калі сціхла гураганная кананада, яна вярнулася ў сваю кануру пад самым дахам. Беражліва несла яна на руках заснуўшага двухгадовага Элю, а Вова сам карабкаўся па лесніцы, трымаючыся за спадніцу маці.

Соня Ісакаўна паклала спаць дзяцей, пагасіла карасінавую лямпу. З трывогай падышла да акна...

Цяжка было на сэрцы.

Лягла і, прыціснуўшы да сябе Элю, заснула трывожным сном...

Перад досвіткам страшэнны ўзрыў скалануў увесь дом. Жанчына нічога не магла зразумець. Яна страціла здольнасць рухацца. Ліхаманкава мільганула думка: гэта смерць... А дзеці?

Нібы ў адказ пачуўся прарэзлівы плач Вовы. Хлопчык біўся ў канвульсіях і галасіў:

— Мама!.. Мама!..

Ён быў кантужаны, у яго аднялася левая ножка. Потым перастала дзейнічаць і правая. Маці праклінала неба, жыццё і азвярэлых людзей, якія пасылалі разбуральныя знарады.

Але ўзышло яркае сонца шчасця. У горад уступілі чырвоныя атрады. Совецкая ўлада ўпэўнена пачала будаваць новае жыццё. Яна дала ўсе правы тым, хто не смеў нават марыць аб іх.

У сям'ю Іодэс з вайны вярнуўся бацька. Соня Ісакаўна пачала думаць, як вылечыць сына. Народны Камісарыят Аховы Здароўя дапамог ёй павезці хлопчыка ў Маскву.

Быў цяжкі дваццаць першы год. Папасці да прафесара для прыезджага было трудна. Але маладая маці не здавалася, яна дабілася свайго.

— Вы звер, а не маці,—сурова сказаў прафесар,—трэба было добра карміць яго і своечасова лячыць, а цяпер позна...

У адказ на гэты прыгавор маці наўзрыд заплакала.

— Што магла я зрабіць?... Ці-ж нам, беднякам, было жыццё, пакуль не прышла совецкая ўлада?..

Яна расказала пра свой цяжкі лёс. Расчулены яе горам, прафесар сказаў:

— Прыносце хлопчыка ў амбулаторыю кожны дзень... Паспрабую што небудзь зрабіць. Але яго трэба добра карміць.

Восем месяцаў пражыла ў Маскве Соня Ісакаўна. Працавала ў больніцы санітаркай. Паёк-хлеб і цукар—аддавала малому.

Нарэшце, удалося палажыць Вову ў больніцу. Там ён пачаў вучыцца. Праз некалькі месяцаў наступіла палепшанне, але неабходны быў перарыў у лячэнні. Маці павезла Вову дамоў. Тут яна аддала хлопчыка ў школу і кожны дзень на руках насіла яго ў клас на трэці паверх.

На працягу пяці год Наркамат Аховы здароўя некалькі раз выклікаў хворага хлопчыка ў Маскву. Маці пакідала маленькіх дзяцей на догляд бацькі і везла хворага Вову.

— І чаго ты толькі мучаешся?.. Усё роўна будзе бязногім. Аддай яго вучыцца ў пратэзную майстэрню, няхай прывучаецца сам сябе карміць,—раілі суседзі, глядзячы на мучэнні мацеры.

Але Соня Ісакаўна не здавалася.

— Зраблю ўсё, каб яго вылечыць, а калі не ўдасца, то няхай ён будзе хаця адукаваным чалавекам.

І сын апраўдаў надзеі сваёй маці. Настаўнікі здзіўляліся яго здольнасцям і стараннасці.

Пятнаццацігадоваму Вове павінны былі зрабіць складаную аперацыю. Маці задумала везці яго ў Ленінград. Стаяла суровая зіма, а сродкаў не было.

Што ўспамінаць... Было трудна. Трэба было неяк жыць... Ну... чысціла снег і лёд на Неве, а сына лячыла...

* * *

У сям'і свята. Старэйшы сын вярнуўся з доўгай камандыроўкі. Сабраліся яго таварышы па рабоце. Прыгожая люстра разлівала яркае святло. Пад люстрай багата прыбраны стол.

Дзве чорнавалосыя дзяўчынкі бегалі каля стала, раскладаючы сурветкі і падсоўваючы крэслы.

— Гатова. Можна садзіцца: зараз мама прынясе вячэру.

Малады чалавек на кастылях з ухмылкай глядзеў на дзяўчатак. Яго рухавы твар бязупынна мяняў свой выраз.

— Я пазнаёмлю вас з усёй нашай сям'ёй, а пакуль што давайце садзіцца,—гучным голасам

С. І. Іодэс.

прамовіў ён, звяртаючыся да сівога інжынера.

— Першы экспанат—гэта я. Семнаццаць год таму назад мы жылі ў кануры. Мой шлях вы ведаеце. Цяпер я інжынер. Другі мой брат Эля—віяланчэліст. За два месяцы да сканчэння ён кінуў музычную школу, паступіў на завод. Тады мяне вазілі на аперацыю, не было сродкаў, і ён павінен быў пайсці працаваць. Цяпер ён стаханавец. Наш трэці — Додзік — выдатнік школы. Ён — мадэліст-вынаходнік. Геся авіямадэлістка і вельмі добра танцуе. Фаня—лепшая выдатніца вучобы.

Твар маладога чалавека дыхаў весялосцю. Ён падняў шклянку залацістага віна і ўсклікнуў:

— Гэты першы бакал я падымаю за нашу квітнеючую, родную краіну. За вялікую радзіму, якая дапамагла маці-работніцы зрабіць з дзіцяці-калекі совецкага інжынера...

Ветлівы твар Соні Ісакаўны асвятліўся ўсмешкай. Яна адказала сыну ласкавым поглядам, поўным мацярынскай гордасці.

Соня Ісакаўна Іодэс не толькі добрая і чулая маці. Яна і прыкладная актывістка. З вялікім стараннем адносіцца яна да сваіх абавязкаў члена Менскага горсавета і старшыні дэпутацкай групы свайго жакта. 8 разоў прэміравалі яе. Работай, актыўнай творчай работай адказвае Соня Ісакаўна партыі і ўраду за шчасце і радасць сваёй сям'і.

Менск А. Алмацінская

НАМ ПІШУЦЬ

КАНДЫДАТ НА ЎСЕСАЮЗНУЮ ВЫСТАЎКУ

Было гэта ў 1934 годзе. Праўленне калгаса рашыла паставіць загадчыкам свінафермы Гэлю Касцюкавец—маладую, белакурую, дзевятнаццацігадовую дзяўчыну.

—Нічога не будзе. Калі мужчыны і то не спраўляліся з гэтай работай, а тут, на табе, жанчыну ставяць, — гаварылі некаторыя калгаснікі.

Гэля дала згоду быць загадчыцай.

— Даю абяцанне, што ў хуткім часе адыход на ферме будзе знішчан,—заявіла яна. Энергічна ўзялася за працу. На ферме многа было непаладкаў. Гэля паставіла пытанне на праўленні калгаса аб ацяпленні і рамонце свінарніка. І гэта хутка было зроблена.

З дня ў дзень ферма станавілася непазнавальнай. Кожная даглядчыца змагалася за тое, каб яе свінні былі лепшымі.

Гэля стрымала сваё слова, якое яна дала калгаснікам. За два гады яе работы загадчыцай фермы, яна дабілася значных поспехаў у развіцці і захаванні свіней.

Калі ў 1934 годзе на ферме мелася 30 свіней, то цяпер маецца 280 штук, супроць планавых 100.

На працягу мінулага году на ферме не было адыходу. Ад 25 свінаматак атрымана 320 штук парасят. Ад двух свінаматак атрымана 34 штукі парасят. Усе яны захаваны. Чатырохмесячныя парасяты важаць па 50 кілограмаў, двухмесячныя—па 13 кілограмаў.

Добрасумленна адносяцца да сваёй працы даглядчыцы. Алена Белан ад 7 свінаматак атрымала прыплоду 76 парасят. Другая даглядчыца, Мар'я Белан, атрымала ад 7 свінаматак—66 парасят. Увесь прыплод захован.

На раённай сельскагаспадарчай выстаўцы свінаферма калгаса заняла першае месца і заваявала права кандыдата на Ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. Цяпер свінаркі разам са сваёй загадчыцай Гэляй рыхтуюць лепшыя экспанаты на Ўсесаюзную выстаўку.

Гэля Касцюкавец стала знатным чалавекам у раёне. Ёю ганарыцца калгас „Асвета". Упартай і добрасумленнай работай Гэля дабілася гэтага.

Мікола Дастанка

Любаньскі раён

ПІСЬМО ТРАКТАРЫСТКІ

Два гады я працую трактарысткай у Магілеўскай МТС. У 1935 годзе я выпрацавала 400 га, у 1936 годзе толькі—300 га,—была ў дэкрэтным адпачынку,—а так выпрацавала-б значна больш, чым у 1935 годзе.

Усебеларуская нарада трактарыстак мне вельмі многа дала. Гэта тая-ж самая вучоба. Я ўважліва прыслухоўвалася да выступленняў лепшых стахановак-трактарыстак, пераймала іх вопыт работы, каб так працаваць самой.

Некалькі слоў пра клопаты аб людзях у нашай МТС.

У верасні мінулага года я пайшла ў дэкрэтыўны адпачынак па цяжарнасці. Але мне не выплацілі за адпачынак. Нават ніхто не расказаў, як і дзе мне павінны выплаціць.

А вось на нарадзе я даведалася, што мне павінны заплаціць. І гэтай справай вельмі зацікавіліся. Расказала аб гэтым я ў прыватнай гутарцы работніку журнала „Работніца і калгасніца Беларусі". Праз поўгадзіны аб гэтым факце стала вядома т. т. Картукову і Бенеку. У сваіх выступленнях яны адзначылі гэта, як здзекі над работніцай, як парушэнне закона, як не чулыя адносіны да жанчыны.

Я вельмі шкадую, што раней не напісала аб гэтым у журнал „Работніца і калгасніца Беларусі",—не было-б такой цягаціны. У далейшым я абавязкова буду пісаць у журнал аб сваёй рабоце і перашкодах, калі яны яшчэ будуць.

На 1937 год, не гледзячы на тое, што я маю малое дзіця, я бяру абавязак выпрацаваць на трактар не менш 1000 га і з'эканоміць гаручага не менш, чым 500 кілограм.

Анна Малашкова

СТАХАНАЎКІ АБАРОННАЙ РАБОТЫ

На нашай фабрыцы работніцы-стахановкі прымаюць самы актыўны ўдзел ва ўмацаванні абароны нашай краіны. Наша стахановка тав. Кірпічнікава—парашутыстка, вучлёт без адрыва ад вытворчасці. Яна ўдзельнічала ў пераходзе у процігазе Гомель—Менск. За гэта Нарком мясцовай прамысловасці тав. Балцін узнагародзіў яе лыжным касцюмам і імянным гадзіннікам.

Тав Дарожка здала норму на значок ГСА і ППХА. Яна таксама ўзнагароджана імянным гадзіннікам за пераход Гомель—Менск.

Лепшыя стахановкі—работніцы Лявіцкая, Пішчык, Школьнікава, Гуменік, Нярэзка, Круглянская з'яўляюцца актыўнымі ўдзельніцамі абароннай работы на прадпрыемстве. Дрэнна толькі тое, што не ўсе новыя работніцы ўцягнуты ў актыўную абарончую работу. Трэба ўмела арганізаваць работу і падрыхтаваць з іх новых значкістаў ГПА, ГСА і ППХА.

Совецкая жанчына—самая шчаслівая ў свеце. Яна абкружана увагай і клопатамі партыі і ўрада і правадыра народаў таварыша Сталіна. За гэтыя клопаты мы, работніцы, любім сваю дзяржаву, сваю партыю, любімага бацьку і друга—таварыша Сталіна. Любім і беражэм сваю радзіму, і калі патрэбна будзе, смела станем на абарону нашых граніц ад фашысцкіх драпежнікаў.

Іда Шэхтман

Гомель, фабрыка „Праца"

У АДКАЗ НА ОРДЖАНІКІДЗЕНСКІ ЗАКЛІК

Работніцы фабрыкі „Комунарка“ горача адгукнуліся на зварот перадавікоў вугольнай прамысловасці Донбаса аб тым, каб абвясціць Орджанікідзенскі заклік у рады стаханаўцаў і ўдарнікаў.

Разгарнулася спаборніцтва паміж брыгадамі і цэхамі. Двухсотніца-завёртшчыца карамельнага цэха—ініцыятар стаханаўскага руху на фабрыцы Малка Цыгельніцкая прапанавала арганізаваць шэфства стаханаўцаў над ударніцамі і адстаючымі з такім разлікам, каб усе завёртшчыцы сталі стаханаўкамі.

Цяпер яны падмацоўваюць гэта канкрэтнымі справамі. Мы бачым папаўненне радоў стахановак на нашай фабрыцы. Раней вытворчыя рэкорды па завёртцы карамельнага цэха належалі тав. Цыгельніцкай. Цяпер яе абганяе Рая Вайнер, выконваючы план на 208 проц.

Фёдарава раней выконвала план на 120—127 проц., а зараз на 140—145 проц.

Работніца-стаханаўка мякказакаладнага цэха Зіна Анейчык на адліўцы цукерак у сакавіку выканала план на 210 проц. За люты месяц у сярэднім Анейчык выканала план на 199 проц., выпускаючы выключна добрую якасць прадукцыі і таму па прагрэсіўнай аплаце зарабіла 579 руб.

Оля Іваноўская на адліўцы цукерак таксама выканала план на 186 проц., Каждан па ўпакоўцы цукерак—на 286 проц.

Работніцы шакаладнага цэха пастанавілі арганізаваць дзве стаханаўскія брыгады імя Орджанікідзе і разгарнуць соцспаборніцтва па ўцягненню ўсіх работніц у рады стаханаўцаў.

Е. Эпштэйн

Мінск

Пры клубе імя Горкага (Барысаў) арганізаваны гурткі дзіцячай самадзейнасці. На здымку: тт. Волкава Лена і Окунь Фаня выконваюць „Венгерскі танец“.
Фота Салавейчыка.

ВЫВУЧАЮ ЛЁТНУЮ СПРАВУ

5 снежня Надзвычайны VIII з'езд Советаў зацвердзіў новую Канстытуцыю, тварцом якой з'яўляецца таварыш Сталін. Гэта—вялікая гістарычная дата ў нашым жыцці.

Я сама нарадзілася разам з Окцябром. Я не ведаю таго беспрасветнага жахлівага жыцця, якое паспытаў на сабе мой бацька. Усё жыццё працаваў ён на капіталістаў. Мізэрнай платы, якую ён атрымліваў, не хапала нават на хлеб.

Аб усім гэтым я ведаю толькі па расказах. Я расту разам з нашай краінай, паспяхова будуючай соцыялізм. Работаю я ў другім калёсным цэху камбіната імя Гікало і з'яўляюся ўвесь час стаханаўкай.

Не дрэнна авалодваю я ведамі ваеннай абароны. Без адрыву ад вытворчасці скончыла планерную школу на „выдатна“, а цяпер вывучаю лётную справу і хутка буду пілотам. Атрымала званне інструктара СПХА. Здала нормы на значкі „Варашылаўскі стралок“ першай ступені, СПХА, ГПА і ГСА.

Не гледзячы на сваю перагружанасць па далейшаму вывучэнню лётнай справы, я аказваю дапамогу сваёй цэхавай асоавіяхімаўскай арганізацыі ў разгортванні абароннай работы.

Я абавязуюся па абароннай рабоце вывесці свой цэх на першае месца па камбінату.

І калі вораг нападзе на нашы межы, я, кіруючы рулём самалёта, буду нанасіць такія ўдары ворагу, каб яму не павадна было саваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод.

Я вельмі рада, што жыву ў такі прыгожы радасны час, калі моладзь і асабліва мы, совецкія дзяўчаты, маем магчымасць авалодваць лётным майстэрствам на карысць сваёй соцыялістычнай радзімы.

Кацуба

Новабеліца

Мае сыны

У час адпачынку я многа думаю: кім будуць мае сыны? Сустракаю байца—здаровага, статнага, з мужным тварам, або чую рокат самалёта і думаю, што мае сыны таксама будуць байцамі і лётчыкамі. І чаму не? Чаму майму Валодзе не быць гордым сокалам нашай раздімы—лётчыкам? Паглядзіце на яго: яму толькі трэці год, а які ён здаровы. Ніколі з яго тварыку не зыходзіць мілая ўхмылка, шчочкі гараць прыгожым румянцам, у вачах здаровы жыццерадасны бляск.

Малы ідзе добра на рост і на папраўку. Я яго нядаўна зважыла: за паўтара месяцы паправіўся амаль на два кілограмы. У добра абсталяваных яслях майму сыну даюць патрэбнае выхаванне. Ён ужо мурлычыць песні. Так што пакуль з мужам мы умовіліся трымаць напрамак такі, каб Валодзю рыхтаваць у лётчыкі.

Першанцу нашаму Косці 5 год. Глядзячы на яго, дзіву даешся, як выдатна фармуецца новы чалавек, як растуць маленькія грамадзяне ў цудоўнай радзіме. Ён ведае па партрэтах усіх нашых дарагіх правадыроў. Ён выбраў ужо сабе прафесію горнага інжынера. І хіба-ж можна сумнявацца ў тым, што яго мары не будуць здзейснены? Вядома, будуць! Бо для гэтага партыя і вялікі правадыр народаў т. Сталін стварыў усе ўмовы.

Сама я працую на камбінаце, а дзеці знаходзяцца ў яслях. Пасля работы забіраю Косцю з сада, а Валодзю з яслей. Да 4 гадзін дня ўся сям'я ў поўным зборы. Радасцю, вяселлем, здаровым дзіцячым задорным смехам напаўняецца мая кватэра.

У такую хвіліну я часта ўспамінаю сваё дзяцінства, праведзенае ў горы і нудзе. 12 дзяцей было ў бацькі, які быў вартаўніком на могілках. Адзін пракарміць такую сям'ю не мог. Мы галадалі, спалі на падлозе, на саломе. 6 дзяцей не вытрымалі такога жыцця і памерлі.

Толькі совецкая ўлада дала нам новае жыццё. Усе мае браты і сёстры жывуць добра. Заможна і весела жыву і я.

Адну думку маю—хачу ўбачыць нашага роднага Сталіна. Гэта было-б для мяне найвялікшым шчасцем. Прызнаюся: калі я па радыё пачула голас роднага Сталіна на VIII З'ездзе Советаў, у мяне ад радасці на вачах з'явіліся слёзы. І ўся мая істота напоўнілася яшчэ большай ўдзячнасцю за наша квітнеючае і радаснае жыццё, за будучыню маіх сыноў.

Марыя Антонаўна Гладкова

Новабеліца,
Камбінат імя Гікало

Шчасце маці

Сорак год я батрачыла, сорак год працавала на кулакоў. Што-ж яшчэ я магла рабіць? Ніхто-ж не клапаціўся аб нас, бедных жанчынах, ды яшчэ аб удовах. Тады не было такога цудоўнага закона, як наша Сталінская Канстытуцыя.

Жыву я цяпер у калгасе заможна, чэсна працую. Мы—самыя шчаслівыя людзі ў свеце. Але і працаваць мы павінны лепш за ўсіх.

Хачу падзяліцца з вамі вялікай радасцю. У мяне, у былой непісьменнай і забітай батрачкі, дачка канчае палітэхнічны інстытут. Яна ўжо піша дыпломную работу, хутка будзе інжынерам.

Дзякую таварышу Сталіну за Канстытуцыю, за яго клопаты аб нас!

Варвара Багданава.

Калгас імя Гамарніка
Віцебскі раён

Хачу быць механікам

Упершыню пасля сканчэння двухмесячных курсаў селі мы, дзяўчаты, на трактар. Гэта было у 1936 годзе.

Памятаю, калі мы выехалі ў поле, з нас смяяліся, не верылі, што мы нароўні з мужчынамі зможам працаваць на трактары. Але мы на справе даказалі, што можам працаваць не горш мужчын, а нават лепш.

Тэхнікай авалодалі мы добра, дэтальна вывучылі трактар, і ён у нас не „капрызіў". Прастояў у рабоце мы не мелі, халастых прагонаў таксама не было. Мы заўсёды зварачалі ўвагу на якасць работы і на выкананне норм.

Наша жаночая трактарная брыгада выпрацавала ў сярэднім па 450 га на кожны трактар пры норме 350 га і з'эканоміла гаручага па 250 кг.

Трэба сказаць, што дапамагалі нам, дзяўчатам, недастаткова, не цікавіліся нашай работай. Былі моманты, што не падвозілі вады, але, каб не мець прастояў, мы самі бегалі за вадой.

Спадзяюся, што ў 1937 годзе нам будуць дапамагаць лепш, а мы будзем яшчэ лепш працаваць.

На заклік, прыняты на Ўсебеларускай нарадзе трактарыстак, я абяцаю выпрацаваць на сваім трактары 1015 га, абавязуюся настойліва вучыцца кіраваць і другімі сельскагаспадарчымі машынамі. Я хачу абавязкова стаць механікам, і хутка ім буду.

Адначасова ўся наша брыгада будзе вывучаць вайсковую справу. Я асабістаа абавязуюся хутка здаць нормы на „Варашылаўскага стралка", каб быць гатовай па першаму закліку нашай партыі стаць на абарону горача любімай радзімы.

Ганна Арастовіч

Кучынская МТС

Пачэсныя абавязкі

Дзевяць год мы жывем у калгасе, у ім я, як і тысячы іншых калгасніц, пазнала радасць калектыўнай творчай працы. Шэсць год працую на малочна-таварнай ферме. За гэты час я выгадавала каля 100 кароў. Увесь час лічуся лепшай ударніцай. За аддаваную працу некалькі разоў прэміравалі мяне.

Зараз я даглядаю 18 кароў. Усе яны своечасова былі пакрыты, за ўвесь час не было выпадку ялавасці кароў. Мы ўпаўне падрыхтаваны сустрэць масавы ацёл.

У мінулым годзе мае рэкардысткі „Баржа", „Вечарынка" і „Пралеска" далі па 3500 літраў малака. У 1937 годзе я ад іх дабюся па 4000—4500 літраў і ўдой астатніх маіх кароў давяду да 3000 літраў у год.

На ферме мы маем 130 дойных кароў і 240 галоў маладняка. Кормім мы кароў па раней складзенаму рацыёну. Наша ферма дае вялікі прыбытак калгасу. Штогодна мы датэрмінова выконваем мантакомясапастаўкі. У 1936 годзе мы звыш плана здалі дзяржаве 11000 літраў малака.

У 1936 годзе я выпрацавала 500 працадзён і атрымала шмат грошай і прадуктаў.

І гаспадарку мы маем добрую. У нас добрая карова, 4 свінні, гусі і 25 курэй. Хлеба і сала ў нас дастаткова.

Маёй маці 70 год. Яна з жахам ўспамінае пакутнае мінулае і не нарадуецца на цяперашняе добрае жыццё. Часта кажа яна:

— Родны Сталін даў нам такое жыццё, што памірaць не хочацца.

Толькі ў нашай шчаслівай квітнеючай краіне, у краіне Сталінскай Канстытуцыі назаўсёды знішчана былое бясправе жанчыны.

Я вучуся ў 5 класе вячэрняй школы, чытаю розную літаратуру, газеты. З вялікім захапленнем вывучыла даклад мудрага Сталіна і матэрыялы Надзвычайнага VIII з'езда Советаў.

Цяпер я буду яшчэ больш актыўна, з удзесяцяронай энергіяй працаваць на маім участку.

Я чытала і матэрыялы Ўсесаюзнай нарады жонак начальніцкага складу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Мой брат—Матвей у Менску у вайсковай школе. Ён хутка таксама будзе камандзірам. Зварот удзельнікаў нарады да нас, калгасніц, выклікаў ў мяне яшчэ большую любоў да вайсковай справы. І мы, калгасніцы, будзем рыхтавацца да нашых пачэсных абавязкаў - гераічна абараняць свяшчэнныя граніцы нашай роднай вялікай квітнеючай краіны.

Нюра Сідаровіч.

Асіпавіцкі раён,
Калгас імя Гікало

М. Горкі

Нараджэнне чалавека

Гэта было ў 92-м, галодным годзе, паміж Сухумам і Очэмчырамі, на беразе рэчкі Кодор, недалёка ад мора—скрозь вясёлы шум светлых вод горнай рэчкі ясна чуцен глухі плеск марскіх хваль.

Восень. У белай пене Кодора круціліся, мільгацелі жоўтыя лісці лаўравішні, нібы маленькія, спрытныя ласосі. Я сядзеў на каменнях над рэчкаю і думаў, што напэўна чайкі і бакланы таксама прымаюць лісце за рыбу і—абманваюцца, вось чаму яны так пакрыўджана крычаць, там, направа, за дрэвамі, дзе плешча мора.

Каштаны нада мной убраны золатам, ля ног маіх—многа лісцяў, падобных на адсечаныя далоні нейчых рук. Галіны граба на тым беразе ўжо голыя і вісяць у паветры разарванаю сеткай; у ёй, нібы злоўлены, скача жоўта-чырвоны горны дзяцел-расудук, стучыць чорным носам па кары ствала, выганяючы насякомых, а спрытныя сініцы і шызыя папоўзні—госці з далёкай поўначы—клююць іх.

Злева ад мяне па вяршынах гор цяжка навіслі, пагражаючы дажджом, дымныя воблакі, ад іх паўзуць цені па зялёных схілах, дзе расце мёртвае дрэва самшыт, а ў дуплах старых букаў і ліп можна знайсці „п'яны мёд", які ў старажытнасці ледзь не загубіў салдат Пампея Вялікага п'янай салодкасцю сваёй, зваліўшы з ног цэлы легіён жалезных рымлян; пчолы робяць яго з кветак лаўра і азаліі, а „праходзячыя" людзі выбіраюць з дупла і ядуць, намазаўшы на лаваш—тонкую ляпёшку з пшанічнай мукі.

Гэтым я і займаўся, седзячы на каменнях пад каштанамі, моцна скусаны злоснай пчалой,—макаў кавалкі хлеба ў кацялок, поўны мёду, і еў, любуючыся ціхай гульнёю зморанага сонца восені.

Увосень на Каўказе, нібы ў багатым саборы, які пабудавалі вялікія мудрацы—яны-ж заўсёды і вялікія грэшнікі—пабудавалі, каб захаваць ад пільных вачэй сумлення сваё мінулае, неабдымны храм з золата, бірузы, ізумрудаў, развесілі па гарах лепшыя дываны, шытыя шоўкамі ў цюркмен, у Самаркандзе, у Шэмале, абрабавалі ўвесь свет і ўсё знеслі сюды, на вочы сонца, як-бы хочачы сказаць яму:

— Тваё—ад Тваіх—Табе.

... Я бачу, як доўгабародыя сівыя волаты, з вялізнымі вачамі вясёлых дзяцей, спускаючыся з гор, упрыгожваюць зямлю, усюды шчодра сеючы рознакаляровыя скарбы, пакрываючы чорныя вяршыні тоўстымі пластамі срэбра, а ўступы іх—жывою тканкай рознастайных дрэў, і—невыказна-прыгожым становіцца пад іх рукамі гэты кавалак шчаснай зямлі.

Надзвычай добрая пасада—быць на зямлі чалавекам, колькі бачыш цудоўнага, як пакутліва салодка хвалюецца сэрца ў ціхім захапленні перад прыгажосцю.

Ну так,—часам бывае трудна, уся грудзь нальецца пякучай нянавісцю, і сум прагна ссе кроў сэрца, але гэта—не заўсёды дана, ды і сонцу часта вельмі сумна глядзець на людзей: так многа папрацавала яно для іх, а—не ўдаліся людзішкі...

Зразумела, ёсць нямала і добрых, але—іх трэба пачыніць або—лепш—перарабіць нанова.

... Над кустамі, улева ад мяне, ківаюцца цёмныя галовы ў шуме хваль мора і гомане рэчкі, ледзь чутна гучаць чалавечыя галасы—гэта „галадаючыя" ідуць на работу ў Очэмчыры з Сухума, дзе яны будавалі шасе.

Я ведаю іх—арлоўскія, разам працаваў з імі і разам разлічыўся ўчора; пайшоў я раней іх, ноччу, каб сустрэць усход сонца на беразе мора.

Чацвёра мужчын і скуластая баба, маладая, цяжарная, з вялізным, уздутым да носа жыватом, спалохана вытарашчанымі вачыма сінявата-шэрага колеру.

Я бачу пад кустамі яе галаву ў жоўтай хустцы, яна ківаецца, нібы квітнеючы падсонечнік пад ветрам. У Сухуме ў яе памёр муж—аб'еўся фруктамі. Я жыў у бараку сярод гэтых людзей: па добрай рускай прывычцы яны гутарылі аб сваіх няшчасцях так многа і голасна, што, мабыць, іх жалобныя прамовы былі чутны вёрст на пяць навакол.

Гэта—сумныя людзі, расціснутыя сваім горам, яно сарвала іх з роднай, зморанай, неўрадлівай зямлі і, як вецер сухое лісце восені, занесла сюды, дзе багацце незнаёмай прыроды—здзівіўшы—асляпіла, а цяжкія ўмовы працы канчаткова прыціснулі гэтых людзей. Яны глядзелі на ўсё тут, збянтэжана міргаючы выцвілымі, сумнымі вачамі, вінавата ўсміхаючыся адзін другому, ціха гаворачы:

— А-яй... якая зямелька...

— Проста—прэ з яе.

— Н-да-а... а, аднак,—камень, бач...

— Нядобрая зямля, трэба сказаць...

І ўспаміналі аб Кабылінай лагчынцы, Сухім гоне, Мокранькім—аб родных месцах, дзе кожная прыгаршня зямлі была прахам іх дзядоў, і ўсё памятна, знаёма, дорага—паліта іх потам.

Была там з імі яшчэ адна баба—высокая, простая, плоская як дошка, з конскімі сківіцамі і цмяным поглядам чорных, нібы вугалі, касых вачэй.

Вечарамі яна, разам з гэтай—у жоўтай хустцы ішла за барак і, седзячы там на гурбе шчэбня, паклаўшы шчаку на далонь, схіліўшы галаву ўбок, спявала высокім і злосным голасам:

За пагостам...
у зялёны-іх куста-ах—
На пясочку...
расцялю я белы плат...
Ці не дачакаюся...
дружка любага майго...
Прыдзе любы...
пакланюся яй яму...

Жоўтая звычайна маўчала, сагнуўшы шыю і разглядаючы свой жывот, але часам раптам, неспадзявана, гультаявата і густа, мужчынскім

сіпаватым голасам уступала ў песню плачучымі словамі:

Ой-ды любы...
ой, любенькі, ты мой...
Не суджана мне...
больш убачыцца з табой...

У чорнай душнай цемры паўднёвай начы гэтыя плачучыя галасы прыпаміналі поўнач, снегавыя пустыні, віск мяцеліцы і аддаленае выццё ваўкоў.

Потым касавокая баба захварэла трасцай і яе знеслі ў горад на насілках з брэзента—яна трэслася ў іх і мычэла, нібы прадаўжаючы спяваць сваю песню аб пагосце і пясочку.

... Ныраючы ў паветры, жоўтая галава знікла.

Я скончыў сваё снеданне, закрыў лісцямі мёд у кацялку, завязаў торбу і не спяшаючы рушыўся ўслед пайшоўшым, пастукваючы кізілавай палкай аб цвёрды грунт сцежкі.

Вось і я на вузкай, шэрай паласе дарогі, справа—калышыцца густасіняе мора; нібы нябачныя сталяры габлююць яго тысячамі фуганкаў—белая стружка, шорхаючы, бяжыць на бераг, ганімая паветрам вільготным, цёплым і пахучым, як дыханне здаровай жанчыны. Турэцкая фелюга, нахіліўшыся на левы борт, плыве к Сухуму, надзьмуўшы парусы, як важны сухумскі інжынер надуваў свае таўстыя шчокі—найсўр'ёзнейшы чалавек. Чамусьці ён гаварыў замест цішэй „чышэй" і „хыць" замест „хоць".

— Чышэй! Хыць ты і бойкі, але я цябе ў момант у паліцыю.

Любіў ён адпраўляць людзей у паліцыю, і прыемна думаць, што цяпер яго, напэўна, ужо даўно да касцей аб'елі чарвякі магілы.

... Ісці—лёгка, нібы плывеш у паветры. Прыемныя думкі, страката апранутыя ўспаміны вядуць у памяці ціхі карагод; гэты карагод у душы—як белыя грэбні хваль на моры, яны зверху, а там у глыбіні—спакойна, там ціха плаваюць светлыя і гнуткія надзеі юнацтва, як срэбныя рыбы ў марской глыбіні.

Дарогу цягне да мора, яна, звіваючыся, падпаўзае бліжэй да пясчанай паласы, куды ўзбягаюць хвалі,—кустам таксама хочацца заглянуць у твар хвалі, яны нахіляюцца праз істужку дарогі, нібы ківаючы сіняй прасторы воднай пустыні.

Вецер падзьмуў з гор—будзе дождж.

... Ціхі стогн у кустах—чалавечы стогн, які заўсёды знаходзіць водгук і ўстрасае душу.

Рассунуўшы кусты, бачу—апіраючыся спіною аб ствол арэха, сядзіць гэтая баба, у жоўтай хустцы, галава апушчана на плячо, рот агідна расцягнуты, вочы выкаціліся і звар'яцелыя; яна трымае рукі на вялізным жываце і так ненатуральна - страшна дыхае, што ўвесь жывот сударгава ўздрыгвае, а баба, прытрымліваючы яго рукамі, глуха мычыць, паказваючы жоўтыя, воўчыя зубы.

— Што—ударылі?—спытаў я, нахіляючыся да яе. Яна сукае, як муха, голымі нагамі ў попельным пыле і, боўтаючы цяжкай галавою, хрыпіць:

— Ідзі-і... бессаромны... ідзі-і...

Я зразумеў у чым справа—гэта я ўжо бачыў аднойчы — зразумела, спалохаўся, адскочыў, а баба голасна, працягла завыла, з вачэй яе, гатовых лопнуць, брызнулі мутныя слёзы і пацяклі па багроваму, натужна-надутаму твару.

Гэта вярнула мяне да яе, я скінуў на зямлю торбу, чайнік, кацялок, абярнуў яе спіною на зямлю і хацеў сагнуць ёй ногі ў каленях—яна адштурхнула мяне, ударыўшы рукамі ў твар і грудзі, павярнулася і, нібы мядзведзіца, рыкаючы, хрыпучы, папаўзла далей у кусты:

— Разбойнік... д'ябал...

Падламіліся рукі, яна звалілася, ткнулася тварам у зямлю і зноў завыла, сударгава выцягваючы ногі.

У гарачцы ўзбуджэння, хутка прыпамятаўшы ўсё, што ведаў па гэтай справе, я перавярнуў яе на спіну, сагнуў ногі—у яе ўжо вышаў каляплодны пузыр.

— Ляжы, зараз народзіш...

Збегаў да мора, закасаў рукавы, вымыў рукі, вярнуўся і—зрабіўся акушэрам...

Баба звівалася, як бярэста на агні, шлёпала рукамі па зямлі вакол сябе і, вырываючы блёклую траву, усё хацела запіхаць яе ў рот сабе, абсыпала зямлёю страшны, нечалавечы твар, з адзічэлымі, налітымі крывёю вачамі, а ўжо пузыр прарваўся і прарэзвалася галоўка,—я павінен быў стрымліваць сударагі яе ног, дапамагаць дзіцяці і сачыць, каб яна не савала траву ў свой перакошаны, мычачы рот...

Мы крыху лаялі адзін аднаго, яна—скрозь зубы, я—таксама не голасна, яна—ад болю і, мабыць, ад сораму, я—ад замяшання і пакутлівай жальбы да яе...

—Х-хоспадзі,—хрыпіць яна, сінія вусны закушаны і ў пене, а з вачэй, нібы раптам выцвіўшых на сонцы, усё льюцца гэтыя бясконцыя слёзы невыносных пакут маці, і ўсё цела яе ламаецца, раздзяляемае надвая.

— Ідзі-і ты, д'ябал...

Слабымі, вывіхнутымі рукамі яна ўсё адштурхвае мяне, я пераканаўча кажу:

— Дурніца, нараджай, знай, хутчэй...

Да болю шкада яе, і здаецца, што яе слёзы пырснулі ў мае вочы, сэрца сціснута сумам, хочацца крычаць, і я крычу:

— Ну, хутчэй!

І вось на руках у мяне чалавек—чырвоны. Хоць і скрозь слёзы, але я бачу—ён увесь чырвоны і ўжо нездаволен светам, барахтаецца, буяніць і густа раве, хоць яшчэ звязан з мацер'ю. Вочы ў яго блакітныя, нос смешна расціснуты на чырвоным, змятым твары, вусны шавеляцца і цягнуць:

— Я-а... я-а...

Такі слізкі,—так і глядзі—выплыве з рух маіх; я стаю на каленях, гляджу на яго, моцна смяюся—вельмі рады бачыць яго. І—запамятаў, што трэба рабіць...

— Рэж...—ціха шэпча маці, вочы ў яе закрыты, твар апаў, ён зямлісты, як у мёртвай, а сінія вусны ледзь шавеляцца:

— Ножыкам перарэж...

Нож у мяне ўкралі ў бараку—я перакусваю пупавіну, дзіця раве арлоўскім басам, а маці—усміхаецца: я бачу, як дзіўна расцвітаюць, гараць яе бяздонныя вочы сінім агнём—цёмная рука шарыць па спадніцы, шукаючы кішэнь, і акрываўленыя, скусаныя вусны шапацяць:

— Н-ня... сілы... тасёмачка... кішэні... перавязаць пупочак...

Дастаў тасёмку, перавязаў, яна—усміхаецца ўсё ярчэй, так хораша і ярка, што я амаль слепну ад гэтай усмешкі.

— Папраўляйся, а я пайду памыю яго...

Яна беспакойна мармоча:

— Глядзі—ціхенечка... глядзі-ж...

Гэты чырвоны чалавечышча зусім не патрабуе асцярожнасці: ён сціснуў кулак і раве, раве, нібы выклікаючы на бойку з ім:

— Я-а... я-а...

— Ты, ты! Умацоўвайся, брат, ямчэй, а то бліжнія зараз-жа галаву адарвуць...

Асабліва сур'ёзна і голасна крыкнуў ён, калі яго ўпершыню абдала пеннай хваляй мора, якая весела хвастанула абодвух нас; потым, калі я пачаў нашлёпваць грудзі і спінку яму, ён заплюшчыў вочы, забіўся і завішчаў праразліва, а хвалі, адна за другою, усё аблівалі яго.

— Шумі, арлоўскі! Крычы ва ўвесь дух...

Калі мы з ім звярнуліся да маці, яна ляжала, зноў закрыўшы вочы, кусаючы вусны, у схватках, выкідваючы паслед, але не гледзячы на гэта, скрозь стогны і ўздыхі, я чуў яе замiраючы шэпт:

— Дай... дай яго...

— Пачакае.

— Дай-ка...

І дрыжачымі, няверными рукамі расшпільвала кофту на грудзях. Я дапамог ёй дастаць грудзь, нарыхтаваную прыродай на дваццаць чалавек дзяцей, прыклаў да цёплага яе цела буйнага арлоўца, ён адразу ўсё зразумеў і замаўчаў.

— Прасвятая, прачыстая, —уздрыгваючы ўздыхала маці і перакатвала растрапаную галаву па торбе з боку на бок.

І раптам, ціха крыкнуўшы, змоўкла, потым зноў адкрыліся гэтыя дзіўна-прыгожыя вочы—святыя вочы радзільніцы, сінія, яны глядзяць у сіняе неба, у іх гарыць і тае ўдзячная, радасная ўсмешка; падняўшы цяжкую руку, маці павольна хрысціць сябе і дзіця...

— Слава табе, прачыстая мацер божая... ох... слава табе...

Вочы пагаслі, праваліліся, яна доўга маўчыць ледзь дыхае, і раптам дзелавіта, ацвярдзеўшым голасам сказала:

— Развяжы, хлопча, торбу маю...

Развязалі, яна зірнула на мяне пільна, слабенька ўсміхнулася; як быццам—ледзь прыметна—румянец бліснуў на апаўшых шчоках і потым на ілбу.

— Адыйдзі...

— Ты вельмі так не вазіся...

— Ну, ну... адыйдзі...

Адышоў недалёка ў кусты. Сэрца як быццам замарылася, а ў грудзях ціха спяваюць нейкія слаўныя птушкі, і гэта—разам з нямоўчным плескам мора—так хораша, што можна-б слухаць год.

Недзе недалёка гурчыць ручэй—быццам дзяўчына расказвае прыяцельцы аб каханым сваім.

Над кустамі паднялася галава ў жоўтай хустцы, ужо завязанай, як трэба.

— Эй, эй, гэта ты, брат, рана завазілася.

Прытрымліваючыся рукою за галінку кустарніка, яна сядзела, нібы выпітая, без крывінкі, у шэрым твары, з вялізнымі сінімі азёрамі на месцы вачэй, і замілавана шаптала:

— Глядзі—як спіць...

Спаў ён добра, але, на мой погляд, нічым не лепш іншых дзяцей, а калі была розніца, дык яна падала на абстаноўку: ён ляжаў на кучы яркіх асенніх лісцяў, пад кустом—якія не растуць у Арлоўскай губерні.

— Ты-б, маці, лягла...

— Не-е,— сказала яна, ківаючы галавою на развінчанай шыі,—мне прыбірацца трэба, ды ісці ў гэныя самыя...

— У Очэмчыры.

— Во-ось. Нашыя-ж, відаць, колькі вёрст адыйшлі...

— Ды ці-ж ты можаш ісці.

— А багародзіца. Дапаможа...

Ну, ужо калі яна разам з багародзіцай,—трэба маўчаць.

Яна глядзіць пад куст на маленькі, нездаволены надуты твар, выпускаючы з вачэй цёплыя праменні ласкавага святла, аблізвае вусны і павольным рухам рукі пагладжвае грудзі.

Я разводжу касцёр, прыладжваю каменні, каб паставіць чайнік.

— Зараз я цябе, маці, чаем пачастую...

— О! Пачастуй... ссохлася ўсё ў грудзях у мяне...

— Што-ж гэта землякі кінулі цябе?

— Яны не кінулі—чаму. Я сама адстала, а яны выпіўшы, ну... і добра, а то як-бы я распасцерлася пры іх...

Зірнуўшы на мяне, яна закрыла твар локцем, потым, сплюнуўшы крывёю, сарамліва ўсміхнулася.

— Першы ў цябе?

— Першанькі... А ты—хто?

— Накшталт як-бы чалавек...

— Канешне, чалавек. Жанаты?

— Не давялося...

— Ілжэш?

— Нашто?

Яна апусціла вочы, падумала.

— А як-жа ты бабскія справы ведаеш?

Цяпер зманю. І я сказаў:

— Вучыўся гэтаму. Студэнт—чула.

— А як-жа. У нас у папа сын старшы студэнт таксама, на папа вучыцца...

— Вось і я з гэтакіх. Ну, пайду за вадой...

Жанчына нахіліла галаву да сына, прыслухалася ці дыхае,—потым паглядзела ў бок мора.

— Памыцца-б мне, а вада незнаёмая... Што гэта за вада... І салёная, і горкая ..

— Вось ты ёю і памыйся—здаровая вада.

— Ой?

— Верна. І цяплей, чым у ручаі, а ручаі тут—як лёд...

— Табе—ведаць...

Дрэмлючы, звесіўшы галаву на грудзі, павольна праехаў абхазец; маленькі конь, увесь з сухажылляў, паводзячы ушамі, пакасіўся на нас круглым чорным вокам—фыркнуў; коннік сцеражліва ўскінуў галавой, у махнатай футравай шапцы, таксама паглядзеў у наш бок і зноў апусціў галаву.

— Якія людзі тут недарэчныя, страх усюды бачаць,—ціха сказала арлоўка.

Я пайшоў. Па каменнях скача, спявае струмень светлай і жывой, як ртуць, вады, у ёй весела куляюцца вясеннія лісці—цудоўна. Памыў рукі, твар, набраў вады поўны чайнік, іду і бачу скрозь кусты—жанчына, трывожна аглядаючыся, паўзе на каленях па зямлі па камнях.

— Чаго табе?

ЦАНА 20 кап. У гэтым нумары бясплатна дасылаецца ўкладка-выкрайка

Спалохалася, пашарэла і хавае нешта пад сябе, я—здагадаўся.

— Дай мне, я зарыю...

— Ой, родненькі. Як-жа? У прыбанніку трэба-б, пад падлогай...

— Ці скора тут баню пабудуюць, падумай.

— Жартуеш, а я—баюся. Раптам звер з'есць... а трэба-ж месца зямлі аддаць...

Адвярнулася ў бок і, падаючы мне сыры, цяжкі вузялок, ціха, сарамліва папрасіла:

— Ужо ты-лепш як-небудзь, паглыбей; дзеля хрыста... шкадуючы сыночка майго, зрабі ўжо як лепш...

— Калі я вярнуўся, то ўбачыў, што яна ідзе, хістаючыся і выцягваючы наперад руку, ад мора, спадніца яе па пояс мокрая, а твар заруменіўся крыху і нібы свеціцца з сярэдзіны. Дапамог ёй дайсці да кастра, здзіўлена думаючы:

— Якая сілішча звярыная.

Потым пілі чай з мёдам, і яна ціхенька спытала мяне:

— Кінуў вучэнне?

— Кінуў.

— Прапіўся, ці што?

— Канчаткова прапіўся, маці.

— Бачыш ты які. А я цябе памятаю, у Сухуме заўважыла, калі ты з начальнікам з-за харчоў лаяўся; так тады і падумалася мне—відаць, прапойца, бясстрашны такі...

І смачна аблізваючы языком мёд на ўспухлых вуснах, усё касілася сінімі вачамі пад куст, дзе спакойна спаў навейшы арловец.

— Як вось ён пажыве,—уздыхнуўшы, сказала яна, аглядаючы мяне:—Дапамог ты мне—дзякуй... а ці добра гэта для яго, і—не ведаю ўжо...

Напілася чаю, паела, перахрысцілася і, пакуль я збіраў сваю гаспадарку, яна, сонна ківаючыся, драмала, думаючы аб нечым, гледзячы ў зямлю зноў выцвіўшымі вачамі. Потым пачала паднімацца.

— Няўжо—ідзеш?

— Іду.

— Ой, маці, глядзі.

— А багародзіца... Дай-ка мне яго.

— Я яго панясу...

Паспрачаліся, яна ўступіла і—пайшлі, плячо ў плячо адзін з другім.

— Каб мне не зваліцца,—сказала яна, вінавата ўсміхаючыся, і паклала руку на плячо маё.

Новы жыхар зямлі рускай, чалавек невядомага лёсу, лежачы на руках у мяне, паважна сапеў. Пляскалася і шуршэла мора, усё у белых карунках стружак; шапталіся кусты, ззяла сонца, перайшоўшы за поўдзень.

Ішлі—ціхенька, часам маці спынялася, глыбока ўздыхаючы, ускідвала галаву ўверх, аглядалася па баках, на мора, на лес і горы, і потым заглядала ў твар сына—вочы яе, наскрозь прамытыя слязмі пакут, зноў былі надзвычайна ясныя, зноў цвілі і гарэлі сінім агнём невычэрпнага кахання.

Аднойчы, спыніўшыся, яна сказала:

— Госпадзі, божанька. Хораша як, хораша. І так-бы ўсё—ішла, усё-б ішла, да самага аж да краю света, а ён-бы сынок—рос ды ўсё-б рос на прыволлі, каля грудзей маці, родненькі мой...

... Мора шуміць, шуміць...

АДНАЎЛЯЙЦЕ СВАЮ ПАДПІСКУ

на двухтыднёвы журнал ЦК КП(б)Б

„Работніца і калгасніца Беларусі"

ПАДПІСНАЯ ЦАНА

на 1 мес.—40 кап. | на 6 мес.—2 р. 40 кап.
на 3 мес.—1 р. 20 кап. | на год—4 р. 80 кап.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях БССР і лістаносцамі

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск. Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 354. Тыраж 10.000 экз. Галоўлітбел № 1977.

Здана ў набор 13/III—37 г. Падпісана да друку 29/III—37 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.